# Ад юрыста да прэм'ер-міністра БНР і гісторыка: жыццёвы шлях Аляксандра Цвікевіча

Без Аляксандра Цвікевіча немагчыма ўявіць гісторыю Беларусі XX стагоддзя. «Цвік», як яго называлі ў сваіх лістах беларускія нацыянальныя актывісты, быў не толькі першым архітэктарам беларускай міжнароднай палітыкі, але і тэарэтыкам беларускага нацыянальнага руху, думкі якога не страцяць сваёй актуальнасці ў Беларусі ніколі. Менавіта дзякуючы яму ў еўрапейскіх палітычных кулуарах у першай чвэрці XX стагоддзя даведаліся, што беларускі народ можа і хоча мець уласную дзяржаўнасць, і такім чынам была закладзена глеба для далейшага «адкрыцця» Беларусі замежнымі палітыкамі. Таксама без Аляксандра Цвікевіча немагчыма ўявіць беларускай гістарыяграфіі XX стагоддзя. Напэўна, па ўзроўні цытавання нават сёння ён можа ўвайсці ў топ-10 беларускіх гісторыкаў, дзякуючы свайму грунтоўнаму даследаванню па гісторыі заходнерусізму. Цвікевіч – беларускі інтэлектуал еўрапейскага ўзроўню, спадчына якога цяпер у поўным аб'ёме адкрываецца беларускаму чытачу.

Нягледзячы на ўсю значнасць асобы Аляксандра Цвікевіча для найноўшай гісторыі Беларусі, на сённяшні час у беларускай ці замежнай гістарыяграфіі не існуе грунтоўнага даследавання яго біяграфіі і творчай спадчыны. Сярод асобных кніг беларускі чытач сёння можа карыстацца толькі невялікай брашурай доктара філалагічных навук Арсеня Ліса «Аляксандр Цвікевіч: выдатны публіцыст і гісторык» (Мінск, 2014). У кнізе вельмі сцісла пададзена біяграфія Цвікевіча, але зроблены грунтоўны агляд яго навуковай і публіцыстычнай спадчыны. Увогуле Арсеня Ліса можна лічыць «адкрывальнікам» асобы А. Цвікевіча ў незалежнай Беларусі: ён з'яўляўся аўтарам некалькіх біяграфічна-папулярных нарысаў, у якіх змяшчалася раней невядомая інфармацыя аб жыцці і дзейнасці гэтага беларускага дзеяча[1]. Адзін з такіх нарысаў друкуецца ў гэтым выданні.

[1] Ліс А. Пасьляслоўе // Цьвікевіч А. «Западноруссизм»: нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Менск, 1993.

Дастаткова грунтоўная, але не пазбаўленая некаторых фактал агічных памылак біяграфія А. Цвікевіча была прадстаўлена ў артыкуле Аляксандра Вабішчэвіча, дзе, сярод іншага, прыведзены сведчанні пра лёс сям'і дзеяча пасля яго арышту ў 1930 г.[2] Таксама іншы гісторык – Анатоль Мяснікоў – уключыў А. Цвікевіча ў свой спіс 100 асоб беларускай гісторыі, прысвяціўшы яму невялікі папулярны нарыс[3]. Павагу заслугоўвае імкненне брэсцкіх краязнаўцаў абудзіць цікавасць да гэтага ўраджэнца Брэста і ўшанаваць яго памяць у гарадской прасторы[4]. Разам з гэтым, амаль ва ўсіх пералічаных працах жыццяпіс Цвікевіча фактычна пачынаецца ад яго грамадскай актыўнасці ў беларускім руху з 1917 г., а гады юнацтва і маладосці характарызуюцца толькі некалькімі сказамі з-за недахопу крыніц, у тым ліку асабістага паходжання. У гэтым нарысе зроблена спроба асвятліць пэўныя лакуны ранняй біяграфіі Аляксандра Цвікевіча, а таксама раскрыць іншыя малавядомыя сюжэты, выкарыстаўшы побач з рознымі крыніцамі дакументальнага плана неапублікаваныя ўспаміны яго старэйшага брата Мікалая Цвікевіча.

У апублікаваных гістарычных працах існуе блытаніна з датай нараджэння Аляксандра Цвікевіча. А. Ліс у сваіх публікацыях падае, што Цвікевіч нарадзіўся 22 чэрвеня 1888 г.[5] У сваю чаргу А. Вабішчэвіч у згаданым вышэй артыкуле прывёў іншую дату – 22 чэрвеня 1883 г.[6] Пры гэтым абодва гісторыкі ні ў адной са сваіх публікацый не спасылаліся на канкрэтныя гістарычныя крыніцы, якія датычылі гэтага факта. Дадзеная блытаніна хутка перайшла ў навуковы зварот, і, фактычна, да сённяшняга часу Аляксандр Цвікевіч мае дзве даты нараджэння[7]. Высветліць

С. 343–348; Ліс А. Цяжкая дарога свабоды: артыкулы, эцюды, партрэты. Мінск, 1994. С. 344–352; Ліс А. Уводзіны ў Аляксандра Цвікевіча // Arche. 2011. № 11. С. 422–443.

[2] Вабішчэвіч А. Аляксандр Цвікевіч (1883–1937) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. № 14. 2000. С. 208–219.

[3] Мяснікоў А. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты. Мінск, 2009. С. 201–204.

[4] Бараноўскі І. Берасцейцы – дзеячы БНР // Рэха Берасцейшчыны. 2009. № 1. С. 10.

[5] Ліс А. Аляксандр Цвікевіч: выдатны публіцыст і гісторык. Мінск, 2014. С. 3.

[6] Вабішчэвіч А. Аляксандр Цвікевіч (1883–1937). С. 208.

[7] Параўн.: Протько Т. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.). Минск, 2002. С. 681; Расстраляная літаратура: творы



*Іван Цвікевіч, бацька Аляксандра Цвікевіча. Фота пачатку XX ст. Са збораў Д. Жыцянёва*

дакладную дату дапамагае гістарычная крыніца – школьны атэстат А. Цвікевіча, які захоўваецца ў яго ўніверсітэцкай справе. У дакуменце дата нараджэння пазначана як 22 чэрвеня 1888 г.[8]

Аляксандр нарадзіўся ў сям'і берасцейскага фельчара чыгуначнай бальніцы Івана Цвікевіча і на той час быў трэцім дзіцём у сям'і. Усяго ў Цвікевічаў было 7 дзяцей, трое з якіх памерлі ў дзяцінстве. Паводле сямейнай гісторыі, якую, у прыватнасці, няблага даследаваў сам Аляксандр, род Цвікевічаў паходзіў са Слонімскага павета. Пачынальнікам яго быў нейкі паляк ці чэх, які разам з напалеонаўскай арміяй апынуўся ў гэтых мясцінах і ажаніўся з мясцовай шляхцянкай – уладальніцай карчмы[9]. Бацька Аляксандра, Іван Іванавіч Цвікевіч, быў сынам селяні-

беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады / [Уклад. Л. Савік, М. Скоблы, К. Цвіркі]. Мінск, 2008. С. 90.

[8] Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (ЦДГА СПб). Ф. 14, воп. 3, спр. 49305, арк. 7.

[9] Житенев Д. Начало-1 // Культура и искусство, 9 ноября 2019 г.: http://www.cult-and-art.net/society/164258-nachalo1.



*Марыя Руткоўская,*
*маці Аляксандра Цвікевіча.*
*Фота 1930-х гг.*
*Са збораў Д. Жыцянёва*

на і паходзіў з мястэчка Галынка Слонімскага павета (цяпер у Зэльвенскім раёне; адсюль і будучы псеўданім Аляксандра Цвікевіча – «Алесь Галынец». – *А. Г.*). У 1877–1878 гг. ён прымаў удзел у расійска-турэцкай вайне, дзе, напэўна, атрымаў кваліфікацыю фельчара. Пасля вайны Іван Цвікевіч пасяліўся ў в. Пескі Слонімскага павета (сёння – у Бярозаўскім раёне) і ажаніўся з Марыяй Руткоўскай. Паводле ўспамінаў сваякоў, па паходжанні яна была полькай і да самай сваёй смерці размаўляла толькі па-польску. У Песках у Івана і Марыі Цвікевічаў нарадзіліся старэйшы сын Мікалай і дачка Надзея[10]. Недзе ў сярэдзіне 1880-х гг. Іван Цвікевіч разам з сям'ёй пераехаў у Берасце і ўладкаваўся на працу фельчарам пры чыгуначнай станцыі. Ужо ў Берасці ў іх нарадзіліся сыны Аляксандр і Іван – будучыя вядомыя дзеячы беларускага руху.

Сям'я Цвікевічаў у пачатку XX ст. жыла ў Берасці жыццём тыповай інтэлігентнай сям'і правінцыйнага горада. У іх доме часта можна было сустрэць розныя навуковыя і папулярныя перыядычныя выданні, літаратуру па розных галінах ведаў і мастацтве. Кожны з дзяцей валодаў музычным інструментам, у прыватнасці, Аляксандр цудоўна граў на фартэпіяна. Бацька сямейства, Іван Цвікевіч, меў значны аўтарытэт сярод берасцейскіх чыгуначнікаў за сваю актыўную жыццёвую пазіцыю. Менавіта па яго ініцыятыве ў Берасці быў адноўлены будынак чыгуначнай бальніцы і адкрыта пачатковая школа для дзяцей чыгуначнікаў[11].

---

[10] Тамсама.

[11] Житенев Д. Начало-2 // Культура и искусство, 10 ноября 2019 г.: http://www.cult-and-art.net/society/164279-nachalo2.

Сярэднюю адукацыю малады Аляксандр атрымаў у Берасцейскай мужчынскай гімназіі імя цэсарэвіча Аляксея, якую скончыў у 1907 г. Паказальна, што ў школьным атэстаце будучага лідара беларускага нацыянальнага руху была адзначана яго асаблівая цікавасць да «русской словесности»[12]. У тым жа годзе ён паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. На той час Пецярбург быў значным гарадскім асяродкам пражывання беларускага насельніцтва – да Першай сусветнай вайны ў сталіцы імперыі пражывала каля 100 тыс. беларусаў, пераважна рабочых і студэнтаў[13]. У пецярбургскіх ВНУ вучылася шмат будучых актывістаў беларускага руху: у прыватнасці, Францішак Умястоўскі, Вацлаў Іваноўскі, Лявон Заяц, Клаўдзій Дуж-Душэўскі, Браніслаў Тарашкевіч, Яўхім Бялевіч і інш.

Знаходзячыся ў чужым этнічным асяроддзі, беларусы больш адчувалі сваю адметнасць і імкнуліся падтрымліваць сувязі. Гэты фактар прывёў да таго, што ў буйных універсітэцкіх цэнтрах Расійскай імперыі ў пачатку ХХ ст. пачалі ствараецца розныя «зямляцтвы» і гурткі беларускіх студэнтаў, якія пасля сталі значным каталізатарам развіцця беларускага нацыянальнага руху і яго правадніком на ўласна беларускія землі. Хрэстаматыйным можа лічыцца прыклад «Круга беларускай народнай прасветы» – студэнцкага гуртка навучэнцаў розных пецярбургскіх ВНУ, з якога выйшла шмат беларускіх актывістаў. У акрэслены перыяд падобныя ініцыятывы ўзнікалі таксама ў Варшаўскім, Юр'еўскім, Маскоўскім універсітэтах[14]. Не быў выключэннем і Пецярбургскі. У 1908 г. у гэтай установе існавала суполка беларускіх студэнтаў – «старроннікаў адраджэння Беларусі», у якую ўваходзіў студэнт юрыдычнага факультэта А. Цвікевіч. Сябры суполкі ў снежні 1908 г. даслалі ў рэдакцыю «Нашай нівы» прывітальны ліст, дзе, сярод іншага, пісалі: «Смелай рукой кідайце ў народ зярнята праўды і вольных думак... Мы ўсімі сіламі падтрымаем Вашу работу»[15]. Сярод

[12] ЦДГА СПб. Ф. 14, воп. 3, спр. 49305, арк. 7.

[13] Латышонак А., Мірановіч Я. Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. Вільня–Беласток, 2010. С. 113.

[14] Ляхоўскі У. Ад гоманаўцаў да гайсакоў: чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.). Беласток–Вільня, 2012. С. 30, 55, 63.

[15] Наша ніва. 1908. № 25. 4 (17) снежня. С. 5.

18 подпісаў, якія стаялі ў канцы ліста, быў і подпіс Аляксандра Цвікевіча, што сведчыць аб пачатках яго нацыянальнай самасвядомасці і зацікаўленасці беларускім рухам ужо на этапе вучобы ва ўніверсітэце.

Відавочна, што побач з беларускім нацыяналізмам Цвікевіч пачаў сутыкацца ў сталіцы імперыі і з сацыялістычнымі ідэямі, без якіх немагчыма ўявіць сабе тагачаснае студэнцкае асяроддзе. Ідэі рэвалюцыйнай змены палітычнага ладу добра адпавядалі духу моладзі, прасякнутай юнацкім максімалізмам. Рэвалюцыйныя і ліберальныя трэнды тых часоў пранікалі ва ўніверсітэты, якія да таго ж актыўна змагаліся за сваю аўтаномію. У часы рэвалюцыі 1905–1907 гг. П. Сталыпін надаў расійскім ВНУ значнае самакіраванне, якое, будучы часовай саступкай, пасля рэвалюцыі пачало звужацца ўладамі. У верасні 1910 г. міністрам народнай асветы Расіі стаў кансерватыўна настроены Леў Касо, які разгарнуў значную барацьбу з «універсітэцкай аўтаноміяй»[16]. Тым не менш, дзеянні ўлад у гэтым пытанні сутыкнуліся з супраціўленнем з боку ліберальнай прафесуры і студэнцкай моладзі, у першую чаргу, Пецярбургскага ўніверсітэта, якія правялі шэраг публічных мерапрыемстваў у абарону ўніверсітэцкай аўтаноміі. У сваю чаргу ўлады ў канцы 1910 г. прынялі некалькі рэпрэсіўных распараджэнняў, паводле якіх забараняліся ўсе студэнцкія сходы ў вышэйшай школе. 23 студзеня 1911 г. пецярбургскія студэнты ў адказ абвясцілі забастоўку з патрабаваннямі аўтаноміі і свабоды сходаў[17]. Кульмінацыя канфлікту студэнтаў з уладамі прыпала на 31 студзеня 1911 г., калі ў будынак Пецярбургскага ўніверсітэта ўвайшла паліцыя. У афіцыйных дакументах дадзеная сітуацыя характарызавалася наступным чынам:

> *Сёння, 31 студзеня, а 8 ½ гадзінах раніцы паліцыя ў вялікай колькасці была ўведзена ва Універсітэт і спачатку размешчана па класнаму калідору (...). Аб 11 гадзіне 30 хвілінах былі праведзены паліцыяй першыя два арышты на калідоры*

---

[16] Маркин В.Л. «Университетский протест» 1911 г. и реакция российского общества // Вестник Московского университета. Сер. 8. История. 2009. № 5. С. 11.

[17] Ростовцев Е.А. 1911 год в жизни университетской корпорации (власть и Петербургский университет) // Кафедра истории России и современная отечественная историческая наука. Санкт-Петербург, 2012. С. 488.

*за свісткі. У гэты час настрой стаў вельмі павышацца. Аб 11 гадзіне 45 хвілінах у некаторых месцах на калідоры каля памяшканняў, дзе знаходзіліся гарадавыя, былі кінуты шклянкі са смярдзючымі рэчамі (...). Каля гадзіны дня на калідоры каля V аўдыторыі, дзе чытаў лекцыю прыват-дацэнт М. І. Туган-Бараноўскі, была ачэплена група студэнтаў з 94 чалавек і адведзена ў асобнае памяшканне; з гэтай групы былі чутны свісткі і спевы*[18].

Усяго пад канец дня паліцыяй у Пецярбургскім універсітэце за рэвалюцыйныя песні і свісткі было арыштавана каля 400 студэнтаў, сярод якіх быў і студэнт юрыдычнага факультэта Аляксандр Цвікевіч[19]. Прычына яго арышту была дастаткова банальная і адлюстроўвала не столькі палітычныя перакананні, колькі выбухны тэмперамент маладога студэнта. Ён у той дзень прыйшоў ва ўніверсітэт без студэнцкага білета, што стала прычынай сваркі з паліцэйскім, які правяраў дакументы юнакоў[20]. Трэба адзначыць, што да гэтага выпадку Цвікевіч быў дастаткова добрасумленным студэнтам і атрымліваў стыпендыю Міністэрства народнай асветы ўсе гады навучання[21].

Пасля затрымання ва ўніверсітэцкім калідоры Цвікевіч быў накіраваны ў Пятроўскую паліцэйскую частку Пецярбурга. У ізалятары часовага ўтрымання правёў каля трох тыдняў, а затым быў вызвалены і дастаўлены этапным парадкам на радзіму. Паралельна з гэтым ён быў выключаны з універсітэта[22]. Разумеючы наступствы гэтай сітуацыі для свайго будучага працаўладкавання, Цвікевіч звярнуўся да міністра народнай асветы з хадайніцтвам аб рэабілітацыі і атрымаў дазвол улад на здачу дзяржаўных экзаменаў, затым паспяхова здаў іх у сакавіку 1912 г. і атрымаў дыплом юрыста II ступені[23]. Тым не менш, яго удзел у студэнцкіх хваляваннях негатыўным чынам

18 Протокол заседаний Совета Императорского С.-Петербургского университета за 1911 год. Санкт-Петербург, 1913. С. 47–49.

19 Тамсама. С. 49.

20 Асабісты архіў Д. Жыцянёва. Успаміны Мікалая Іванавіча Цвікевіча.

21 ЦДГА СПб. Ф. 14, воп. 3, спр. 49305, арк. 30.

22 Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. 102, воп. 173, спр. 134, арк. 1.

23 ЦДГА СПб. Ф. 14, воп. 3, спр. 49305, арк. 46.

адбіўся на юрыдычнай кар'еры ва ўмовах расійскага імперскага грамадства.

Аналіз архіўных дакументаў дазваляе сцвярджаць, што пасля заканчэння ўніверсітэта Аляксандр Цвікевіч, нягледзячы на пэўныя рэверансы ў бок беларускага руху і ліберальных ідэй, быў пэўны час лаяльным грамадзянінам расійскай дзяржавы, чалавекам існуючай сістэмы, які бачыў сваё станаўленне і самарэалізацыю выключна ў рамках імперскай рэчаіснасці. Сваім першым месцам працы малады юрыст выбраў пасаду малодшага суддзі ў Гарадзенскім акруговым судзе, аднак яму было адмоўлена па прычыне «неблагонадежности». Такі ж самы адказ прыйшоў з Кіеўскай судовай палаты, куды ён накіраваў прашэнне. Разумеючы, што «індульгенцыю» можна атрымаць толькі ў вышэйшых пецярбургскіх улад, Цвікевіч у 1913 г. звярнуўся з прашэннем да дырэктара Дэпартамента паліцыі Міністэрства ўнутраных спраў аб наданні станоўчай рэкамендацыі для будучага працаўладкавання ў Кіеве. Сярод іншага, у прашэнні падкрэслівалася:

> *Лічу сваім абавязкам заявіць, што ні да якіх партый і гурткоў ніколі не належаў, сімпатый да дзейнасці супрацьзаконнай не маю і ўвогуле бачу ў сабе працаўніка на карысць закону і дзяржавы, а не беспарадку і бунтуючых жарсцяў*[24].

На жаль, прашэнне Цвікевіча так і не было задаволена і ён не змог працаўладкавацца ў Кіеў. У 1912–1914 гг. ён працаваў памочнікам адваката ў Берасці і падаваў вялікія надзеі на паспяховую кар'еру. Аднак з-за асабістага канфлікту з берасцейскімі чыноўнікамі, прычынай якога зноў стаў дзёрзкі тэмперамент Цвікевіча, у самым пачатку Першай сусветнай вайны ён са сваёй сям'ёй пераехаў у Пружаны і там працягваў займацца адвакацкай практыкай[25].

Малавядомым у біяграфіі А. Цвікевіча з'яўляецца той факт, што ў 1913 г. у яго пачаліся сухоты, верагодна, выкліканыя знаходжаннем у пецярбургскай турме. Зімой 1913–1914 гг. ён лячыўся

---

[24] ДАРФ. Ф. 102, воп. 173, спр. 134, арк. 1.

[25] Асабісты архіў Д. Жыцянёва. Успаміны Мікалая Іванавіча Цвікевіча; Вабішчэвіч А. Аляксандр Цвікевіч (1883–1937). С. 208.

ў санаторыі ў Сухумі, дзе, паводле ўспамінаў брата Мікалая, недастаткова добра вытрымліваў лячэбны рэжым.

> *Саша зіму правёў у гэтым санаторыі, прычым, як пісаў бацька ў другім лісце, паводзіў сябе зноў легкадумна, не здзяйсняў прадпісанняў рэжыму. Валачыўся па вечарах за бабамі, а, вядома, хворым пасля заходу сонца нельга знаходзіцца паза домам. Асабліва ў гарах, дзе ноччу моцны перападак тэмпературы*, – пісаў Мікалай Цвікевіч[26].

Тым не менш, дзякуючы лячэнню, хвароба паступова пачала сыходзіць.

Неабходна заўважыць, што, нягледзячы на ўдзел у беларускай студэнцкай суполцы ва ўніверсітэцкія гады, Аляксандр Цвікевіч пасля выпуску з універсітэта ў 1912 г. і да 1917 г. ніякім чынам не прымаў удзел у беларускім руху, прынамсі на сённяшні час падобных фактаў не выяўлена. Увогуле, ён вырас у рускамоўным інтэлігенцкім асяроддзі павятовага горада і руская культурная і інтэлектуальная традыцыя была неразрыўна побач з ім у гады яго дзяцінства і юнацтва. Паводле ўспамінаў яго брата, іх бацька выпісваў папулярны «сямейны» часопіс «Ніва», а таксама спецыяльна для дзяцей замаўляў выданні з «Бібліятэкі самаадукацыі» і іншыя навукова-папулярныя кнігі на рускай мове для развіцця кругагляду[27]. Таму руская мова для Цвікевіча была на той час мовай зносін, думак і нават яго першай публіцыстыкі ў рамках беларускага руху. Як прыгадваў яго брат, Цвікевіч прынамсі на пачатку Першай сусветнай вайны не ведаў беларускай мовы[28]. Падобная сітуацыя была характэрна для многіх беларускіх дзеячаў, якія выраслі ў русіфікаваным асяроддзі і «прыйшлі» ў беларускі рух у 1917 г. Таму невыпадкова, што ў 1917–1918 гг. руская мова паралельна з беларускай выкарыстоўвалася дзеячамі беларускага нацыянальнага руху, а ў некаторых выпадках і пераважала.

У 1915 г., калі нямецкія войскі пачалі наступаць на заходнюю частку беларускай тэрыторыі, Аляксандр Цвікевіч разам

---

[26] Асабісты архіў Д. Жыцянёва. Успаміны Мікалая Іванавіча Цвікевіча.

[27] Житенев Д. Начало-3 // Культура и искусство, 10 ноября 2019 г.: http://cult-and-art.net/society/164281-nachalo3.

[28] Асабісты архіў Д. Жыцянёва. Успаміны Мікалая Іванавіча Цвікевіча.



*Аляксандр Цвікевіч (сядзіць другі злева) сярод сяброў Тульскага бежанскага камітэта. 1916 г. ДАРФ. Ф. Р-4939, воп. 1. спр. 89. арк. 1. Друкуецца ўпершыню*

з сям'ёй быў вымушаны падацца ў эвакуацыю і пераехаць з Гарадзенскай губерні ў Тулу. Тут ён актыўна ўключыўся ў дабрачынную дзейнасць, звязаную, у першую чаргу, з бежанскім пытаннем. На той час ва ўнутраных губернях Расіі толькі з Гарадзенскай губерні апынулася больш за 900 тыс. бежанцаў[29]. Пачалі ствараццa розныя камітэты і ўстановы, якія аказвалі дапамогу бежанцам у рассяленні, пошуках працы і адаптацыі да новых умоў жыцця. У падобных ініцыятывах пачаў сваю дзейнасць у Туле і Аляксандр Цвікевіч. Акрамя гэтага, ён з'яўляўся сябрам аддзела апекі над дзецьмі Рускага таварыства аховы народнага здароўя[30]. У Туле Цвікевіч жыў па адрасе: вуліца Нова-Паўшынская, дом 86.

Кантакты беларускіх бежанцаў са шматнацыянальным насельніцтвам расійскіх рэгіёнаў і сацыяльная адаптацыя да новых

[29] Карнялюк В. Міграцыя беларускага насельніцтва, выкліканая Першай сусветнай вайной. Гродна, 2019. С. 89.

[30] Памятная книжка Тульской губернии на 1917 год. Тула, 1917. С. 111.



*Аляксандр Цвікевіч (у цэнтры) і яго малодшы брат Іван (злева) у Туле. 1916 г. Са збораў Д. Жыцянёва*

умоў жыцця выступілі значным каталізатарам іх нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, разумення сваёй адметнасці, што выклікала пашырэнне ў бежанскім асяроддзі ідэй беларускага нацыянальнага руху. Увогуле, роля бежанства часоў Першай сусветнай вайны на сённяшні час з'яўляецца вельмі недаацэненай пры вывучэнні гісторыі станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці і нацыятворчага працэсу. Бежанскія грамадскія ініцыятывы, якія першапачаткова ўзнікалі па рэгіянальным прынцыпе (напрыклад, «Саюз грамадзян Гарадзенскай губерні» і інш.), паступова набывалі нацыянальныя беларускія рысы, асабліва пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Падобныя змены адбываліся і з Аляксандрам Цвікевічам, які ва ўмовах бежанства пачаў разумець сваё беларускае паходжанне і бачыць нацыянальную адметнасць. Цікавымі з'яўляюцца словы Мікалая Цвікевіча, які, з'яўляючыся носьбітам рускай культурнай традыцыі, здзівіўся такім зменам у свайго брата. «Тут, у Туле, Саша раптам, не ведаю ўжо чаму, пачаў лічыць сябе беларусам», – пісаў Мікалай Цвікевіч ва ўспамінах.

Выхад Аляксандра Цвікевіча на беларускую палітычную «сцэну» быў звязаны з вырашэннем бежанскіх пытанняў і дзейнасцю Беларускай народнай грамады (БНГ). Утварэнне палітычнай арганізацыі беларускіх бежанцаў, рассеяных па ўсёй Расіі, стала магчыма толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі і кардынальных змен у палітычным жыцці. 9 мая 1917 г. на мітынгу ў Маскоўскім універсітэце па ініцыятыве беларускіх інтэлектуалаў была

ўтворана Беларуская народная грамада[31]. У кіруючыя структуры БНГ уваходзілі археолаг Язэп Васілевіч, юрыст Аляксандр Цвікевіч, гісторык Фёдар Турук, протаіерэй Іаан Карчынскі, настаўніца Палута Бадунова і іншыя прадстаўнікі беларускага бежанства. Паводле ўспамінаў беларускіх дзеячаў Яўсея Канчара і Нестара Перавоя, БНГ утварылася па ініцыятыве маскоўскіх сяброў Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ), аднак адразу ж ператварылася ў пэўную альтэрнатыву БСГ з яе левадыкальнай палітычнай праграмай[32]. У склад БНГ маглі ўваходзіць не толькі сацыялісты, але і людзі, якія не падзялялі сацыялістычныя погляды, напрыклад, праваслаўныя святары ці ліберальная інтэлігенцыя. У палітычнай праграме БНГ прысутнічала патрабаванне аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі, палітычных свабод, права карыстацца роднай мовай у адукацыйнай і судовай сферах. На практыцы, аднак, сябры арганізацыі не заўсёды прытрымліваліся гэтых установак, а некаторыя з іх працягвалі заставацца, напрыклад, адэптамі ідэалогіі заходнерусізму[33]. Тым не менш, на восень 1917 г. БНГ з'яўлялася другой пасля БСГ палітычнай арганізацыяй беларускага насельніцтва, а яе актыў дасягаў прыблізна 400 чалавек. Аддзелы арганізацыі дзейнічалі выключна ў асяроддзі беларускіх бежанцаў – у Калузе, Туле, Саратаве, Оршы, Таржку і інш.[34]

Як адзін з кіраўнікоў БНГ Аляксандр Цвікевіч пачаў паступова пранікаць на вышэйшыя арганізацыйныя паверхі тагачаснага беларускага руху. Першым значным мерапрыемствам, у якім ён прыняў актыўны ўдзел, быў з'езд беларускіх арганізацый і партый у Менску 8–11 ліпеня 1917 г. У першы дзень з'езда Цвікевіч выступіў з прывітальнай прамовай ад імя БНГ і яе тульскага аддзела, прадставіў прысутным праграму арганізацыі, падкрэсліўшы яе несацыялістычны характар і жаданне аб'яднаць вакол сябе прадстаўнікоў розных слаёў грамадства. Паказальна, што

[31] Рудовіч С. Беларуская народная грамада // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мінск, 1993. С. 383.

[32] Короткова Д. Белорусские организации революционной России в воспоминаниях Е.С. Канчера // Славянский альманах. 2018. № 3–4. С. 195; Фіонік Д. Беженство. Дорога і повороты 1915–1922. Bielsk Podlaski, 2015. С. 178.

[33] Рудовіч С. Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск, 2001. С. 106.

[34] Короткова Д. Белорусские организации революционной России... С. 195.

Цвікевіч таксама заклікаў усіх беларусаў «інтарэсы бацькаўшчыны паставіць вышэй партыйных заданняў»[35]. Ужо ў гэтай прамове пачало праяўляцца імкненне гэтага дзеяча да пошуку кампрамісаў, якое стала важнай рысай яго далейшай палітычнай біяграфіі.

Падчас другога дня з’езда праводзіліся дыскусіі аб далейшай арганізацыйнай працы беларускага руху і палітычнай будучыні беларускіх зямель. Прапаноўвалася замест Беларускага нацыянальнага камітэта стварыць новы каардынацыйны орган беларускіх палітычных і грамадскіх ініцыятыў. Яшчэ адным важным пытаннем была выпрацоўка будучага дзяржаўна-прававога статусу Беларусі як аўтаноміі ў складзе Расіі. Падчас дэбатаў па дадзеных пытаннях слова ўзяў таксама Аляксандр Цвікевіч. У прамове былі адлюстраваны яго раннія погляды на ідэю беларускай дзяржаўнасці, на якія ў шмат чым уплывалі яшчэ слабое знаёмства з тагачасным беларускім нацыянальным дыскурсам і разуменне неабходнасці кампрамісаў. Цвікевіч заявіў, што Беларусь яшчэ не гатовая да палітычнай аўтаноміі і прапанаваў засяродзіць увагу на «больш рэальных справах» – стварэнні гаспадарчай аўтаноміі, якая б мела крыху заканадаўчых функцый. На той час ён выступаў супраць дэцэнтралізацыі Расіі, апелюючы да таго, што яе «народы прывыклі ўжо жыць у блізкіх адносінах адны з другімі». Адмоўна выказваўся Цвікевіч і наконт стварэння адзінага каардынацыйнага цэнтра беларускага руху, бо заходняя частка Беларусі была адарвана ад агульнабеларускага палітычнага жыцця[36]. У цэлым, можна сцвярджаць, што першапачатковыя погляды Цвікевіча адносна нацыянальнага пытання былі вельмі блізкімі да праграмы партыі кадэтаў і ліберальнай інтэлігенцыі, часткай якой, верагодна, яшчэ адчуваў сябе малады адвакат у часы Лютаўскай рэвалюцыі. Прамова Цвікевіча выклікала парыраванне з боку Паўла Алексюка і Рамана Скірмунта, якія абаранялі імкненне беларусаў да дзяржаўна-палітычнай аўтаноміі, што, урэшце, і было замацавана ў рэзалюцыі з’езда. Таксама на ліпеньскім форуме была ўтворана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый, якая пасля была

[35] Зьезд дэлегатаў ад беларускіх партыйных і грамадзянскіх арганізацый 8–10 ліпня ў Мінску // Вольная Беларусь. 1917. № 9. С. 3.

[36] Рудовіч С. Час выбару. С. 130; Смалянчук А. Раман Скірмунт (1868–1939): жыццяпіс грамадзяніна Краю. Мінск, 2018. С. 312.

перайменавана ў Вялікую беларускую раду – кіруючы орган усяго нацыянальнага руху ва ўсходняй частцы Беларусі.

Нягледзячы на першыя спробы ў палітыцы, А. Цвікевіч заставаўся актыўным удзельнікам бежанскага руху, дзе займаў на той час не апошнюю ролю. У верасні 1917 г. па ініцыятыве БНГ у Маскве быў арганізаваны Першы беларускі з'езд бежанцаў, на якім прысутнічала каля 70 дэлегатаў з розных губерняў Расіі (у дакументах гэты з'езд называўся Першым беларускім з'ездам у Маскве. – *А. Г.*). Цвікевіч быў абраны старшынёй з'езда, што сведчыла пра яго ўжо пэўны аўтарытэт у бежанскім асяроддзі. Таксама ён выступіў з дакладам «Становішча бежанскай справы ў Расіі і задачы з'езда ў гэтым пытанні», дзе падкрэсліў цяжкае становішча беларускіх бежанцаў і звяртаў увагу на адсутнасць уласнай арганізацыі. Між іншым, у дакладзе прапаноўвалася стварыць шырокае прадстаўніцтва бежанцаў-беларусаў у розных бежанскіх камітэтах і арганізаваць беларускі аддзел пры Асобнай нарадзе па ўладкаванні бежанцаў пры расійскім Міністэрстве ўнутраных спраў, што было падтрымана ўдзельнікамі з'езда[37]. Фактычна ўпершыню дзякуючы А. Цвікевічу беларускія бежанцы палітычна і юрыдычна пачалі разумецца не як катэгорыя рэгіянальная, а як нацыянальная, з агульнымі патрэбамі, праблемамі і будучыняй. Тым не менш, ажыццявіць прынятыя рашэнні з'езда на практыцы не выпала магчымасці: у Расіі адбыўся Кастрычніцкі пераварот і на парадак дня былі выстаўлены зусім іншыя задачы.

На першым беларускім бежанскім з'ездзе былі абмеркаваны таксама некаторыя палітычныя пытанні, у прыватнасці, будучы статус беларускіх зямель і выбары ва Устаноўчы сход Расіі. Спробы дзеячаў БНГ знайсці «залатую сярэдзіну» і аб'яднаць розныя ідэалагічныя сілы выявіліся ў прыняцці асцярожнай рэзалюцыі аб наданні Беларусі «шырокага абласнога самакіравання ў межах Расійскай рэспублікі», найвышэйшы орган якога павінен быў мець заканадаўчыя функцыі[38]. Таксама з падачы А. Цвікевіча з'ездам была прынята рэзалюцыя аб дасягненні дамоўленасці з партыяй эсэраў аб уключэнні ў яе перадвыбарчыя спісы ва Устаноўчы сход беларускіх бежанцаў[39]. Эсэры на той час

[37] Карнялюк В. Міграцыя беларускага насельніцтва... С. 133–134.

[38] Рудовіч С. Час выбару. С. 160.

[39] Карнялюк В. Міграцыя беларускага насельніцтва... С. 135.

былі найбольш папулярнай і пазнавальнай сілай у Расіі, асабліва ў сялянскім асяроддзі, таму разлік на падтрымку гэтай партыі быў дастаткова лагічным. Аднак па нейкіх прычынах дамоўленасць не была дасягнута, і БНГ пачала ўласную выбарчую кампанію. Аб'яднаўшыся з беларускімі цэнтрысцкімі арганізацыямі і нават структурамі «заходнярускай» накіраванасці (Магілёўскі беларускі камітэт, Аршанскі беларускі народны камітэт, гомельскі Саюз беларускай дэмакратыі), БНГ зарэгістравала ўласны выбарчы спіс № 8 у Магілёўскай выбарчай акрузе (спіс атрымаў простую назву – «Беларускі спіс № 8»). На аб'яднаным сходзе прадстаўнікоў гэтых арганізацый, які адбыўся ў Магілёве 12 кастрычніка 1917 г., першым нумарам у выбарчым «Беларускім спісе» быў зацверджаны прадстаўнік БНГ А. Цвікевіч[40]. На сённяшні час даследчыкамі не выяўлены рэальныя лічбы, якія ўдалося набраць «Беларускаму спісу» ў Магілёўскай губерні падчас выбараў, якія адбываліся ўжо ва ўмовах прыходу да ўлады бальшавікоў у лістападзе 1917 г. Вядома толькі, што па Магілёўскай акрузе ва Устаноўчы сход былі абраныя 12 сяброў партыі эсэраў, 2 бальшавікі і 1 прадстаўнік яўрэйскіх арганізацый[41].

Кастрычніцкі пераварот 1917 г. шмат у чым паўплываў на расстаноўку сіл у беларускім руху і пазіцыю многіх актывістаў па праблеме далейшага самавызначэння Беларусі. Заявы бальшавікоў аб хуткім заключэнні міру з Германіяй прыводзілі многіх беларускіх дзеячаў да страху тэрытарыяльнага падзелу Беларусі паміж рознымі краінамі, што стала значным імпульсам для канчатковага вырашэння пытання аб фармаванні беларускай дзяржаўнасці. 27 кастрычніка 1917 г. Вялікая беларуская рада выдала вядомую адозву «Да ўсяго Народа Беларускага», дзе пазначала, што ва ўмовах анархіі і страты рэвалюцыйных свабод Беларусь толькі ўласнымі сіламі можа забяспечыць свой нацыянальны лёс у выглядзе дэмакратычнай рэспублікі ў складзе федэратыўнай Расіі. З гэтай мэтай ВБР склікала на 5 снежня 1917 г. з'езд прадстаўнікоў беларускага народа

[40] Агееў А., Пушкін І. Фарміраванне і дзейнасць Магілёўскага беларускага камітэта (1917–1918 гг.). Магілёў, 2017. С. 38–39; Воробьев А.А. Выборы в Учредительное собрание на территории северо-западных губерний России (Витебской, Минской, Могилевской, Псковской и Смоленской). Могилев, 2013. С. 48.

[41] Воробьев А.А. Выборы в Учредительное собрание... С. 49.

ў Менску[42]. Паралельна з гэтым прадстаўнікі Беларускага абласнога камітэта пры Усерасійскім савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК), якія разглядалі Беларусь у якасці звычайнай вобласці Расіі, абвясцілі пра скліканне ўласнага з'езда на 15 снежня 1917 г.[43] Тым не менш, ужо ў новых палітычных умовах многія беларускія дзеячы, нават цэнтрысцкай арыентацыі, паступова пераходзілі на пазіцыі «рэспубліканцаў». У прыватнасці, маскоўская БНГ з яе ранейшым цэнтрызмам падтрымала менавіта ініцыятыву Вялікай беларускай рады. Пра гэта сведчыць адмысловая дэлегацыя БНГ у Петраград да БАК, у склад якой уваходзіў і А. Цвікевіч. Дэлегацыя падкрэсліла, што маскоўскія беларусы, аб'яднаныя вакол БНГ, прызнаюць Раду кіраўніком беларускага руху і заклікаюць «абласнікоў» далучыцца да іх супольнай дзейнасці па скліканні з'езда[44].

Ва Усебеларускім з'ездзе 1917 г. Аляксандр Цвікевіч прыняў значны ўдзел як спецыяліст па бежанскіх справах, як юрыст і як выдатны аратар. Падчас адкрыцця з'езда 7 снежня 1917 г. менавіта ён вітаў гэты форум ад імя беларускіх бежанцаў, што яшчэ раз падкрэслівала яго безапеляцыйны аўтарытэт у бежанскім асяроддзі[45]. У сваёй прамове Цвікевіч адлюстраваў цяжкае становішча бежанцаў і яшчэ пакуль узгадваў «агульную маці Расію», аднак, як бачна вышэй, паступова яго погляды адносна беларускай дзяржаўнасці змяняліся ў бок нацыянальнай самастойнасці. Малады, але аўтарытэтны адвакат (на той час Цвікевічу было 29 гадоў, што яшчэ раз адлюстроўвае сацыяльныя ліфты рэвалюцыі 1917 г., якія далі шанц многім маладым людзям узысці на вяршыні беларускага руху) увайшоў у склад Савета І Усебеларускага з'езда і ўзначаліў бежанскую секцыю. У праекце рэзалюцыі гэтай секцыі, распрацаванай Цвікевічам, утрымлівалася 44 пункты канкрэтных эканамічных, сацыяльных і юрыдычных прапаноў па паляпшэнні становішча бежанцаў і іх вяртанні на радзіму[46]. У прыватнасці, адной з прапаноў

---

[42] Турук Ф. Белорусское движение. Минск, 1994. С. 97–99.

[43] Тамсама. С. 104.

[44] Канчер Е. Из истории Гражданской войны в Белоруссии в 1917–1920 гг. // Беларуская думка. 2010. № 2. С. 72.

[45] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі / [Уклад С. Шупа]. Т. 1. Кн. 1. Вільня–Нью-Ёрк–Менск–Прага, 1998. С. 24.

[46] Проекты резолюции, выработанные беженской секцией // Белорусская рада. 1917. № 12. С. 2.

Цвікевіча, якая сёння мала дзе ўзгадваецца, было стварыць у Менску цэнтральны эканамічны орган, які, сярод іншага, каардынаваў бы пытанні сацыяльнай апекі над бежанцамі за межамі краю. Дзякуючы гэтай прапанове 16 снежня 1917 г. з'езд прыняў палажэнне аб стварэнні Беларускага краёвага эканамічнага савета – фактычна першага беларускага гаспадарча-дзяржаўнага органа ў найноўшай гісторыі Беларусі[47]. Паводле ўспамінаў Макара Краўцова, менавіта Аляксандр Цвікевіч, схільны да кампрамісаў, быў аўтарам знакамітай гістарычнай рэзалюцыі з'езда па палітычным пытанні, якая задавальняла дзве непрымірымыя групы дэлегатаў з'езда: «рэспубліканцаў» і «абласнікоў». Рэзалюцыя, у якой з'езд пастанаўляў стварыць Усебеларускі Савет сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў як часовы орган краёвай улады, так цалкам і не была прынятая па прычыне разгону агульнабеларускага форуму бальшавікамі[48].

Пасля разгону Усебеларускага з'езда ў біяграфіі Аляксандра Цвікевіча пачынаецца новая старонка, звязаная з пачаткам яго дыпламатычнай дзейнасці. Яшчэ падчас правядзення з'езда было вырашана накіраваць на мірныя перамовы ў Берасці адмысловую беларускую дэлегацыю, каб, прынамсі, заявіць сусветнай супольнасці імкненне беларускага руху да непадзельнасці Беларусі. Прыблізна ў канцы снежня 1917 г. Выканаўчы камітэт Рады Усебеларускага з'езда сфармаваў дэлегацыю ў складзе Сымона Рак-Міхайлоўскага, Аляксандра Цвікевіча і Івана Серады. Цвікевіч на той час кепска валодаў беларускай мовай, але вельмі добра нямецкай, менавіта таму, напэўна, і быў уключаны ў склад гэтай місіі. Першапачаткова дэлегацыя выехала ў Берасце непасрэдна з Менска, аднак была затрыманая немцамі на лініі фронту па просьбе бальшавікоў і была вымушана вярнуцца назад у Менск[49]. На гэты раз было вырашана прабівацца на перамовы праз украінскую тэрыторыю, а ў складзе дэлегацыі засталіся толькі дзве асобы – Рак-Міхайлоўскі і Цвікевіч. Іх мытарства па Украіне, ахопленай грамадзянскай вайной, працягнулася ўвесь студзень і пачатак лютага 1918 г. Толькі 15 лютага

[47] Всебелорусский съезд // Белорусская рада. 1917. № 12. С. 3.

[48] Краўцоў Макар. 20 гадоў назад (Успаміны пра Усебеларускі зьезд 1917 г.) // Шлях моладзі. 1938. № 6. С. 2.

[49] Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 1. 1917–1922 гг. / [Склад. У.М. Міхнюк і інш.]. Мінск, 1997. С. 33.

1918 г. беларусы, атрымаўшы статус кансультантаў украінскай дэлегацыі, змаглі трапіць у Берасце, аднак час быў ужо згублены: кіраўнікі савецкай і нямецкай дэлегацый пакінулі Берасце, а краіны Цэнтральнага блока рыхтаваліся да ваенага наступу на савецкія тэрыторыі[50]. Цвікевіч і Рак-Міхайлоўскі змаглі толькі падаць кароткую даведку аб беларускім руху прадстаўніку нямецкай дэлегацыі Шылеру, таму што той, па ўласным сведчанні, «мала што ведаў пра беларускі рух»[51]. Сам Шылер нічога не вырашаў у нямецкім дыпламатычным корпусе, дый сама даведка была матэрыялам другаснага значэння. Не мела канкрэтных вынікаў і тэлефонная размова беларусаў з савецкім дыпламатам Караханам[52]. 7 сакавіка 1918 г., не дасягнуўшы ніякіх вынікаў, беларуская дэлегацыя вярнулася ў Менск, які ўжо быў заняты нямецкімі акупацыйнымі войскамі[53].

Хоць беларуская дэлегацыя, не маючы адпаведнага досведу дыпламатыі і палітычнай вагі, не змагла ўзняць «беларускае пытанне» на берасцейскіх мірных перамовах, яна здолела зрабіць адну важную рэч для беларускага руху і дзяржаўнага будаўніцтва, якую і сёння мала заўважаюць дасведчаныя гісторыкі. Апынуўшыся на акупаванай тэрыторыі, Рак-Міхайлоўскі і Цвікевіч змаглі ўвайсці ў кантакт з беларускім актывам у Вільні. Фактычна ўпершыню беларускія дзеячы з Усходняй Беларусі даведаліся пра палітычныя погляды і праекты братоў Луцкевічаў, Вацлава Ластоўскага і іншых прадстаўнікоў беларускага руху, якія не даходзілі ў Менск з-за лініі фронту. У палітычным лексіконе Рак-Міхайлоўскага і Цвікевіча з'яўляецца словазлучэнне «незалежнасць Беларусі», якое ва ўсходнебеларускім дыскурсе ўспрымалася вельмі асцярожна і нават дзіўна. У адным з лістоў яны просяць віленскіх беларускіх дзеячаў растлумачыць ім гэтае паняцце, бо ўвогуле не вераць у магчымасць Беларусі існаваць як асобная дзяржава[54]. Пранікненне незалежніцкіх тэндэнцый у менскае беларускае асяроддзе і змены ў палітычных поглядах адносна незалежнасці Беларусі ў самога

[50] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кн. 1 / [А.А. Каваленя і інш.]. Мінск, 2011. С. 354.

[51] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 49.

[52] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 35.

[53] Wiadomości bieżące // Placówka (Mińsk). 1918. Nr. 48. S. 2.

[54] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 35.

Цвікевіча адбываліся, у тым ліку, і дзякуючы гэтаму нядоўгаму кантакту з Вільняй.

Апынуўшыся ў Менску ў сакавіку 1918 г., Аляксандр Цвікевіч адразу акунуўся ў вір беларускага палітычнага жыцця. Менск сакавіка 1918 г. рэзка адрозніваўся ад таго Менска, скуль Цвікевіч выязджаў у Берасце. У горадзе ўжо не было бальшавіцкіх камісараў, а беларускі рух выйшаў з падполля, утварыў уласны ўрад і пачаў працэс стварэння беларускай дзяржаўнасці, апелюючы да пастаноў Усебеларускага з'езда. Была прынята II Устаўная грамата, у якой Беларусь абвяшчалася народнай рэспублікай. Паралельна з гэтым, у беларускіх гарадах існавала мясцовае самакіраванне, сфармаванае яшчэ ва ўмовах рэвалюцыйнага ўсплеску 1917 г., з якім беларускаму руху раней ці пазней давялося б шукаць узаемнага прызнання. Гарадскія думы, якія складаліся збольшага з прадстаўнікоў агульнарасійскіх і яўрэйскіх партый, наіўна захоўвалі настальгію па «дэмакратычнай федэратыўнай Расіі» і вельмі асцярожна ставіліся да беларускай дзяржаўнасці. Таму беларускім структурам, і ў першую чаргу Народнаму сакратарыяту БНР, зноў спатрэбіўся кампрамісны талент Аляксандра Цвікевіча і яго выдатнае аратарскае майстэрства. 18 сакавіка 1918 г. ад імя ўрада БНР ён выступіў з бліскучай прамовай у Менскай гарадской думе, у якой заклікаў гласных падтрымаць беларускую ініцыятыву і маральна, і матэрыяльна. Дзякуючы Цвікевічу Менская гарадская дума большасцю галасоў прыняла пастанову кааптаваць у склад Рады Усебеларускага з'езда (неўзабаве – Рады БНР) прадстаўнікоў гарадскога і земскага самакіраванняў, падтрымала II Устаўную грамату і выдаткавала на патрэбы Народнага сакратарыята БНР 10 000 рублёў[55]. Яшчэ 3000 рублёў для беларускага ўрада Аляксандр Цвікевіч «знайшоў» у Менскай губернскай земскай управе[56]. Гэта быў значны «стартавы капітал» для беларускага ўрада, які дапамог яму рэалізаваць многія як дыпламатычныя, так і культурна-асветніцкія праекты.

Правал беларускай дэлегацыі ў Берасці паказаў, што Беларусь як дзяржаўнае ўтварэнне не магла існаваць без міжнароднай рэпрэзентацыі, ці, іншымі словамі, без «міжнароднага самапіяру»,

---

[55] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 55–58.

[56] ДАРФ. Ф. 6063, воп. 1, спр. 2, арк. 126.

асабліва, калі яе тэрыторыя акупавана, а акупанты не клапоцяцца пра будучыню беларускай дзяржаўнасці. Да таго ж адсутнасць нацыянальна ангажаванай буржуазіі і нацыянальна свядомай эміграцыі – патэнцыйных спонсараў ўрада БНР прыводзіла да пастаяннага недахопу грашовых сродкаў, якія трэба было шукаць у знешніх партнёраў. Першым месцам на мапе сваіх дыпламатычных кантактаў дзеячы БНР выбралі Кіеў. Прычын такога выбару было некалькі. Па-першае, беларусы ўжо мелі пэўны досвед супрацоўніцтва з украінскімі палітыкамі падчас «берасцейскай дэлегацыі». Па-другое, урад УНР, які лічыў беларускае Палессе этнічнай украінскай тэрыторыяй, пачаў накіроўваць у паўднёвыя паветы БНР (Гомельскі, Рэчыцкі і інш.) сваіх камісараў, таму на парадак дня выходзіла пытанне беларуска-ўкраінскай мяжы. 22 сакавіка 1918 г. Рада і Народны сакратарыят БНР пастанавілі накіраваць у Кіеў «дэлегацыю ў справах перагавораў» у складзе А. Цвікевіча і С. Рак-Міхайлоўскага. Кожнаму на паездку быў выдадзены аванс у памеры 1000 рублёў, а таксама наступныя рэкамендацыі: адчыніць беларускае прадстаўніцтва ва Украіне, выкарыстаць кіеўскі радыётэлеграф для інфармавання міжнароднай супольнасці аб утварэнні БНР, распачаць перамовы аб расійска-беларускай і ўкраінска-беларускай межах па этнаграфічным прынцыпе, узняць пытанне перад украінскім урадам аб тавараабмене, выдачы крэдыту і інш.[57] Дадзеныя рэкамендацыі, на нашу думку, могуць сведчыць пра тое, што прыблізна за тры дні да абвяшчэння незалежнасці БНР яе кіраўніцтва прынамсі ўжо разумела Беларусь як незалежны суб'ект міжнароднай палітыкі, што асабліва падкрэслівалася жаданнем усталявання дзяржаўных межаў. Сам Цвікевіч, хутчэй за ўсё, не прымаў удзел у вядомым пасяджэнні Рады БНР, на якім была зацверджана III Устаўная грамата, бо ад'ехаў у Кіеў.

Першая беларуская дэлегацыя ва Украіне мела пэўны поспех для дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, хоць і не ўсе запланаваныя пункты былі здзейснены. Прыехаўшы ў Кіеў, Цвікевіч як кіраўнік дэлегацыі далучыў да яе працы мясцовы беларускі актыў, сярод якога, напрыклад, былі вядомы гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі і набліжаны да структур УНР

[57] Тамсама, арк. 124; Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 60.

Іван Краскоўскі. Менавіта дзякуючы апошняму Цвікевіч правёў у красавіку 1918 г. перамовы з кіраўніком Украінскай цэнтральнай рады Міхайлам Грушэўскім, міністрамі замежных, вайсковых і ўнутраных спраў Украіны, на якіх былі ўзнятыя пытанні беларуска-ўкраінскіх узаемаадносін: прызнання незалежнасці БНР, усталявання агульнай мяжы, дапамогі ў фармаванні беларускіх ваенных частак, якія знаходзіліся на ўкраінскай тэрыторыі[58]. І хоць УНР дэ-юрэ не прызнала Беларусь, аднак пэўныя практычныя захады ва ўсталяванні добразычлівых двухбаковых адносін былі зроблены. Дзякуючы ўмяшальніцтву Цвікевіча ўкраінскія ўлады не дазволілі выслаць з Украіны ў Беларусь II корпус Войска Польскага, які мог стаць значным узмацненнем для тых частак I корпуса на чале з Юзафам Доўбар-Мусніцкім, якія ўжо дзейнічалі на ўсходнебеларускай тэрыторыі. Беларускай дэлегацыі быў дадзены дазвол выкарыстаць кіеўскую тэлеграфную станцыю і аб'явіць сусветнай супольнасці аб абвяшчэнні незалежнасці БНР[59]. Акрамя гэтага, 19 красавіка 1918 г. пачала працу беларуска-ўкраінская камісія па вызначэнні дзяржаўных межаў, дзейнасць якой, аднак, не мела практычнага плёну[60].

Дыпламатычная дзейнасць Аляксандра Цвікевіча і яго падначаленых працягвалася ў Кіеве і пасля дзяржаўнага перавароту 29 красавіка 1918 г., калі да ўлады прыйшоў гетман Паўло Скарападскі. Менавіта з новым урадам Украінскай дзяржавы беларуская дэлегацыя заключыла першую ў найноўшай гісторыі Беларусі міжнародную гандлёвую ўгоду – 15 тысяч кубаметраў дроў з Мазырскага павета былі прададзены ўкраінцам за 300 000 рублёў, з якіх 125 000 былі перададзены непасрэдна ў карыстанне Народнага сакратарыята БНР, а астатнія засталіся на рахунках беларускіх арганізацый ва Украіне[61]. Малавядомым з'яўляецца той факт, што дзякуючы гэтым грашам Цвікевіч набыў у Кіеве аўтамабіль, які збіраўся пры першай магчымасці перадаць у карыстанне беларускага ўрада[62]. Акрамя гэтага, ва ўкраінскай сталіцы была ўтворана Беларуская гандлёвая палата

[58] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 86.

[59] ДАРФ. Ф. 6063, воп. 1, спр. 2, арк. 108.

[60] Міхалюк Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. Смаленск, 2015. С. 211.

[61] ДАРФ. Ф. 6063, воп. 1, спр. 2, арк. 83.

[62] Тамсама, арк. 83 адв.

на чале з Мітрафанам Доўнар-Запольскім і адчынена генеральнае консульства БНР, кіраўніком якога стаў Павел Трамповіч. Дэлегацыя на чале з Цвікевічам правяла ў Кіеве шэраг перамоў з прадстаўнікамі РСФСР, Аўстра-Венгрыі, Польшчы, а таксама з дэлегацыямі некалькіх дзяржаўных утварэнняў на асколках былой Расійскай імперыі – Кубанскай Народнай Рэспублікі і Паўднёва-ўсходняга саюза казачых войскаў, горцаў Каўказа і вольных народаў стэпаў. У прыватнасці, старшыня ўрада апошняй структуры прапанаваў аказаць БНР дапамогу ў памеры ад 3 да 5 мільёнаў рублёў, чаго ў рэальнасці, аднак, так і не адбылося[63].

Вярнуўшыся ў Менск, Аляксандр Цвікевіч 15 чэрвеня 1918 г. дакладваў пра пэўныя поспехі дыпламатычнай місіі ва Украіне на пасяджэнні ўрада БНР. Яго паспяховая дзейнасць у Кіеве была пазітыўна ацэнена беларускім кіраўніцтвам, у тым ліку і матэрыяльна – ён атрымаў прыбаўку да свайго заробку ў памеры 1000 рублёў, і ў цэлым яго штомесячны заробак складаў цяпер 1600 рублёў[64]. Адразу ж па ініцыятыве Цвікевіча была арганізавана новая дыпламатычная місія, на гэты раз – у Маскву. Беларускія дзеячы выдатна разумелі, што без перамоў з Савецкай Расіяй пытанне міжнароднага прызнання Беларусі не зможа зрушыцца з мёртвай кропкі. Аднак дэлегацыя БНР на чале з Цвікевічам у расійскай сталіцы была сустрэта вельмі холадна. Народны камісар замежных спраў РСФСР Георгій Чычэрын некалькі разоў адмовіў ёй у прыёме[65]. Адзінае, што здолеў зрабіць Цвікевіч – сустрэцца з маскоўскімі беларусамі, у тым ліку са Змітром Жылуновічам, каб даведацца пра іх дзейнасць, а таксама выступіць на адкрыцці Беларускага навуковага таварыства ў Маскве ў ліпені 1918 г.[66] 26 кастрычніка 1918 г. распараджэннем Народнага сакратарыята БНР місія, з-за адсутнасці станоўчых вынікаў, была адклікана з Масквы.

У лістападзе 1918 г. Аляксандр Цвікевіч упершыню ўвайшоў у склад урада БНР, які пачаў фармаваць Антон Луцкевіч. У Радзе міністраў БНР яму было адведзена месца міністра

[63] Тамсама, арк. 83.

[64] Тамсама, арк. 82.

[65] Тамсама, арк. 2.

[66] Белорусское научное общество в Москве // Дзянніца. 1918. № 24. С. 2–3; Елісееў А. Зміцер Жылуновіч: чырвоны адраджэнец. Мінск, 2019. С. 44.

юстыцыі, аднак збольшага ён працягваў выконваць розныя дыпламатычныя даручэнні, фактычна з'яўляючыся архітэктарам міжнароднай палітыкі Беларусі[67]. 22 лістапада 1918 г. ён спешна пакінуў Менск і зноў выехаў ва Украіну з мэтай наладзіць зносіны з новымі уладамі – Дырэкторыяй УНР, не ведаючы, што вернецца ў беларускую сталіцу толькі праз сем гадоў. Пачыналася «адысея» Цвікевіча па еўрапейскіх краінах, мэтай якой было дамагчыся міжнароднага прызнання Беларусі і знайсці фінансавыя сродкі для беларускага нацыянальнага руху.

За 1918 год палітычныя погляды Аляксандра Цвікевіча рэзка змяніліся ў бок узмацнення нацыянальнай самасвядомасці. Калі ў пачатку года ён яшчэ захоўваў ілюзіі наконт Беларусі як часткі нейкай федэратыўнай супольнасці з Расіяй, пра што сведчыла яшчэ яго рыторыка падчас выступу ў Менскай гарадской думе ў сакавіку 1918 г., то на працягу невялікага адрэзка часу пасля абвяшчэння ІІІ Устаўной граматы БНР ён становіцца паслядоўным прыхільнікам дзяржаўнай самастойнасці Беларусі. Пешапачаткова самастойнасць Беларусі разумелася ім як вымушаны акт, каб «адмежавацца ад Велікаросіі і яе шалёнага ўрада» дзеля захавання адзінства краіны ва ўмовах вайны, аднак пазней незалежнасць для Цвікевіча будзе арганічнай з'явай нацыянальных памкненняў беларускага народа. Паводле А. Ліса, Цвікевіч прымаў удзел у складанні трох устаўных грамат, аднак на сённяшні дзень у дакументальных крыніцах не знойдзена пацвярджэння дадзенага факта[68]. У прыватнасці, падчас прыняцця ІІІ Устаўной граматы на пасяджэнні Рады БНР радны А. Цвікевіч, хутчэй за ўсё, адсутнічаў, бо знаходзіўся ўжо ва Украіне. Цікавым з'яўляецца факт, што ўжо перакананы незалежнік А. Цвікевіч у лісце да А. Луцкевіча ў пачатку 1919 г. выбачаецца, што... не ведае роднай мовы, і абяцае напісаць наступны ліст па-беларуску[69]. Абяцанне было выканана, і далейшая карэспандэнцыя Цвікевіча была ўжо беларускамоўная.

Верагодна, дзякуючы сталым знаёмствам Аляксандра Цвікевіча з украінскай палітычнай элітай, якія ён набыў за папярэдні перыяд, у лютым 1919 г. урад УНР выдаў беларусам крэдыт

[67] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 302.
[68] Ліс А. Уводзіны ў Аляксандра Цвікевіча. С. 426.
[69] Чернякевич А. БНР. Триумф побежденных. Минск, 2018. С. 260.

у памеры чатырох мільёнаў карбованцаў. Адразу на рукі беларускай дэлегацыі ў Кіеве былі перададзены 100 000 украінскіх карбованцаў і 900 000 расійскіх рублёў, а астатнія грошы былі пакладзены на рахункі ў берлінскі (на імя В. Ластоўскага) і венскі (на імя А. Цвікевіча) банкі[70]. Вяртаючыся ў Беларусь, прадстаўнікі беларускай дэлегацыі Аляксандр Цвікевіч, Аркадзь Смоліч і Васіль Захарка былі абрабаваныя невядомымі злачынцамі на станцыі Здалбунаў Валынскай губерні – у іх скралі каля 120 000 рублёў[71]. Хутчэй за ўсё, пасля гэтай падзеі яны падзялілі паміж сабой рэшту грошай і дабіраліся ў Горадню, дзе знаходзіўся старшыня ўрада БНР А. Луцкевіч, кожны сваім шляхам. У прыватнасці, Цвікевіч прыбыў у горад недзе ў пачатку сакавіка 1919 г., бо ўжо 15 сакавіка ён прымаў удзел у першым пасля эвакуацыі з Менска пасяджэнні ўрада БНР[72]. Гарадзеншчына, на тэрыторыі якой на той час яшчэ заставаліся нямецкія акупацыйныя войскі, была толькі часовым прытулкам для дзеячаў БНР. Немцы паступова адыходзілі, з усходу набліжаліся бальшавікі, а з захаду прэтэнзіі на землі былой Рэчы Паспалітай выказвала польская дзяржава. Таму ўрад БНР вырашыў актыўна шукаць падтрымку для рэалізацыі сваіх дзяржаўніцкіх стратэгій на міжнароднай арэне. 23 сакавіка 1919 г. Аляксандр Цвікевіч разам з іншымі сябрамі беларускага ўрада выехаў з гарадзенскага чыгуначнага вакзала на захад.

Першапачаткова пасля выезду з Беларусі Аляксандр Цвікевіч, паводле рэкамендацыі старшыні беларускага ўрада А. Луцкевіча, павінен быў зноў ехаць ва Украіну, каб дастаць неабходныя паперы для атрымання часткі ўкраінскага крэдыту, што захоўвалася ў венскім банку. Аднак ён так і не змог перайсці лінію польска-ўкраінскага фронту і затрымаўся ў Празе, дзе, між іншым, правёў некалькі сустрэч з французскімі і ўкраінскімі дыпламатамі[73]. Каб нарэшце атрымаць «венскія грошы», за лінію фронту ўрадам БНР быў накіраваны спецыяльны эмісар – Яўгенія Аляксюк, якая ў надзвычай цяжкіх умовах канспірацыі, подкупу і затрыманняў даставіла Цвікевічу неабходныя паперы, па якіх ён адразу ж, у жніўні 1919 г., атрымаў у Вене

[70] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 333–334.

[71] Тамсама. С. 329.

[72] Тамсама. С. 330.

[73] Тамсама. С. 346.

доўгачаканыя 3 мільёны крон[74]. Далейшая праца Цвікевіча ў 1919 г. была звязаная з трохкутнікам Берлін–Астрог–Варшава. У прыватнасці, у нямецкай сталіцы ён супрацоўнічаў з Надзвычайнай дыпламатычнай місіяй БНР, выконваў розныя дыпламатычныя даручэнні, у тым ліку і працу сярод беларусаўваеннапалонных у Германіі, а таксама рыхтаваў да выдання сваю брашуру «Беларусь». Цікава, што ў гэтай невялікай кніжцы, выдадзенай у Берліне, аўтар быў пазначаны як «доктар Аляксандр Цвікевіч». Уласна Цвікевіч не меў доктарскай ступені, аднак гэтае дапаўненне, хутчэй за ўсё, было звязана з нямецкай акадэмічнай традыцыяй – у Германіі дактарамі лічылі ўсіх, хто скончыў поўны ўніверсітэцкі курс і абараніў не дыпломны праект, а дысертацыю. Не забываў Цвікевіч наведваць у гэты час і Астрог – горад на Валыні, дзе на той час у яго старэйшага брата Мікалая пражывала яго жонка і дзеці. У верасні 1919 г. у Астрогу нарадзіўся сын Аляксандра Цвікевіча – Віктар.

Тагачасныя геапалітычныя погляды Цвікевіча былі добра адлюстраваны ў яго лісце да Аркадзя Смоліча ад 24 жніўня 1919 г., напісаным, дарэчы, ужо на беларускай мове. Не адмаўляючыся ад ідэалаў незалежнасці, Цвікевіч разумеў, што ў неспрыяльных міжнародных, палітычных і эканамічных абставінах Беларусі самастойна будзе вельмі цяжка замацаваць сваю дзяржаўнасць і таму для яе неабходны федэратыўныя сувязі з больш моцнымі дзяржаўнымі арганізмамі. Ужо тады ён дастаткова скептычна ставіўся да магчымасці польска-беларускага збліжэння і рабіў стаўку на Украіну.

> *Пакуль што я як Член Урада беларускага ўстрымліваюся ад адказу на пытанне аб адносінах да Польшчы, стая прынцыпіяльна на грунце фэдэрацыі з Украінай, і як худшага зла – з Расеяй*, – падкрэсліваў Цвікевіч у лісце[75].

Перакананне, што Польшча на той час не жадала бачыць Беларусь у якасці самастойнага суб'екта еўрапейскай палітыкі, яшчэ больш узрасло ў поглядах Цвікевіча пасля сустрэчы з польскім лідарам Юзафам Пілсудскім у Варшаве ў верасні 1919 г. Сустрэча была арганізавана па ініцыятыве старшыні

[74] Сакалоўскі У. Надзвычайная місія БНР у Нямеччыне (1919–1925) // Arche. 2009. № 3. С. 106.

[75] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 411.



*Аляксандр Цвікевіч (у цэнтры ў пенснэ) у сямейным коле. Фота 1910-х гг. Са збораў Д. Жыцянёва. Друкуецца ўпершыню*

ўрада БНР А. Луцкевіча, які запрасіў на яе і Цвікевіча, бо той, напэўна, якраз у гэты час таксама знаходзіўся ў Варшаве. У размове з беларускімі дзеячамі Пілсудскі на просьбу вызначыць форму беларуска-польскіх узаемаадносін даў наступны адказ:

> *Для таго каб паміж мной і прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху ўсталяваўся кантакт (...), неабходна цалкам прызнаць польскую дзяржаву, падпарадкавацца польскім уладам і перастаць гаварыць пра незалежнасць Беларусі. Незалежнасць Беларусі – блеф, прынамсі, у цяперашні час (...). Задача беларускіх дзеячаў заключаецца ў тым, каб, абапіраючыся, арыентуючыся на Захад, на заходнюю культуру, пад пратэктаратам Польшчы ліквідаваць усе сляды ўплыву рускай культуры*[76].

[76] Аляксандр Цвікевіч: «Ліквідацыя БНР не была манеўрам», «Візіт да Пілсудскага» [паказанні, дадзеныя следчым АДПУ пасля арышту па справе «Саюза вызвалення Беларусі»] / Падрыхт. Э.А. Ліпецкі і У.М. Міхнюк // Маладосць. 1993. № 1. С. 229.

Па ўспамінах Аляксандра Цвікевіча, гэтыя словы Пілсудскага зрабілі на яго «засмучальнае ўражанне» і знішчылі тыя невялікія сімпатыі да Польшчы як да краіны, што змагалася ў мінулым з расійскім самаўладдзем разам з іншымі народамі[77]. Размова з польскім лідарам, а дакладней яе вынік, далі штуршок Цвікевічу сесці за пяро і напісаць адно са сваіх найбольш значных палітычных даследаванняў – «Адраджэнне Беларусі і Польшча», у якім ён падкрэсліў немагчымасць прымірыць тагачасную польскую дзяржаву з беларускім нацыянальным праектам.

Узрастанне антыпольскіх тэндэнцый у беларускім руху прывяло да расколу Рады і ўрада БНР у снежні 1919 г. Паланафільская частка беларускіх дзеячаў стварыла Найвышэйшую раду БНР, якая працягнула паўнамоцтвы старшыні ўрада А. Луцкевічу і спрабавала абапірацца на польскія ўлады ў вырашэнні праблем беларускага нацыянальнага жыцця. Іх апаненты, пераважна з боку беларускіх эсэраў, выступілі супраць польскай акупацыі беларускіх зямель і ўтварылі Народную раду БНР на чале з Пятром Крачэўскім, а таксама новы кабінет міністраў пад кіраўніцтвам Вацлава Ластоўскага. У гэты «эсэраўскі» ўрад БНР завочна ўвайшоў Аляксандр Цвікевіч, спачатку на пасаду міністра юстыцыі, а з чэрвеня 1921 г. ён пачаў выконваць яшчэ і абавязкі міністра замежных спраў[78]. У пачатку 1920 г. Крачэўскі разам з Ластоўскім, хаваючыся ад праследу з боку палякаў, пераехалі ў Берлін і сустрэліся з Цвікевічам. Пачаўся новы этап барацьбы дзеячаў БНР за міжнароднае прызнанне Беларусі ва ўмовах польска-савецкай вайны.

Пазней А. Цвікевіч у сваіх паказаннях для органаў АДПУ ўзгадваў:

> *Амаль увесь 1920 год мы жылі ў Берліне, дзе была місія БНР дэ-факта, прызнаная нямецкім урадам. Работу праводзілі на грошы, атрыманыя ад украінцаў у 1919 годзе*[79].

Праўда, ён забыўся ўзгадаць, што ўкраінскія грошы ўжо паступова заканчваліся. Тым не менш, менавіта на гэты перыяд прыпадае інтэнсіўная праца дзеячаў БНР на міжнароднай арэ-

[77] Тамсама. С. 230.
[78] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 2. С. 1121.
[79] Аляксандр Цвікевіч: «Ліквідацыя БНР не была манеўрам»... С. 215.

не, звязаная са спробай узняць «беларускае пытанне» на польска-савецкіх перамовах. Падчас летняга наступу Чырвонай арміі ў 1920 г., калі бальшавікамі была занята ўся тэрыторыя Беларусі і ў Менску было паўторна абвешчана аб утварэнні ССРБ, Цвікевіч у Вене сустрэўся з прадстаўнікамі РСФСР Варшаўскім і Дзятлавым. Ён заявіў савецкім дэлегатам, што калі Масква прызнае незалежнасць беларускай савецкай рэспублікі ў яе этнаграфічных межах, то ўрад БНР перадасць свае паўнамоцтвы гэтай дзяржаве[80]. Аднак гэтая прапанова была праігнаравана савецкім бокам. 27 верасня 1920 г. дэлегацыя БНР у складзе Вацлава Ластоўскага, Аляксандра Цвікевіча, Антона Аўсяніка і Аляксандра Галавінскага прыехала ў Рыгу, каб паспрабаваць прабіцца на мірныя перамовы між Савецкай Расіяй і Польшчай і паказаць, што лёс беларускіх зямель могуць вырашаць толькі прадстаўнікі беларускага народа[81]. Нягледзячы на тое, што дзеячы БНР не былі дапушчаны да ўдзелу ў перамовах, яны аказвалі пэўны ціск на савецкую дэлегацыю, для якой «беларускае пытанне» ўжо зрабілася важным фактарам у дыпламатычнай гульні[82]. Дасведчаныя савецкія дыпламаты, якія раней ігнаравалі міжнародную актыўнасць урада БНР, цяпер вымушаны былі выклікаць у Рыгу прадстаўнікоў беларускага савецкага ўрада, каб стварыць пэўную супрацьвагу і мець уласныя козыры на беларускім напрамку.

Тым не менш, не маючы ніякіх рэальных практычных вынікаў на рыжскіх перамовах, з фактычна пустым бюджэтам, многія дзеячы БНР ужо восенню 1920 г. упершыню задумаліся пра тое, каб скончыць «гульню» і пераехаць у савецкі Менск. Адным з фактараў прыняцця такога рашэння магла выступаць звычайная бытавая рэчаіснасць – у беларускіх актывістаў былі сем'і, дзеці, якія жадалі ўладкаванага забяспечанага жыцця, а не пераездаў па розных еўрапейскіх гарадах услед за бацькамі[83]. Але намер выехаць у Савецкую Беларусь быў тады адкладзены – вырашальную ролю ў гэтым адыграла Літва. У кастрычніку 1920 г. польскія часткі пад кіраўніцтвам Люцыяна Жалігоўскага захапілі Вільню, пачаўшы тым самым новы вітак польска-літоўскага

[80] Чернякевич А. БНР. Триумф побежденных. С. 170.
[81] Сегодня (Рига). 1920. № 212. С. 2.
[82] А.А. Іофэ – Г.В. Чычэрыну // Скарыніч. 2006. Вып. 6. С. 71–72.
[83] Чернякевич А. БНР. Триумф побежденных. С. 214–215.

канфлікту. Літва хутка пачала шукаць саюзнікаў для барацьбы за Віленшчыну, і выбар паў менавіта на ўрад БНР. Для заключэння ўзаемнага дагавора да літоўскага ўрада ў Коўна выехаў галоўны перамоўшчык БНР – Аляксандр Цвікевіч[84]. Пры яго ўдзеле як юрыста быў распрацаваны дагавор аб супрацоўніцтве паміж БНР і Літвой, падпісаны 11 лістапада 1920 г. Згодна з ім, Літва прызнавала ўрад БНР, надавала сваю тэрыторыю для яго дзейнасці, выдавала беларусам грашовую дапамогу ў памеры 1 мільёна нямецкіх марак і абяцала падтрымку на міжнароднай арэне. У сваю чаргу ўрад БНР павінен быў ажыццявіць шырокую антыпольскую прапаганду на тэрыторыі Віленшчыны і Гарадзеншчыны, утварыць падпольныя ўзброеныя аддзелы для барацьбы з палякамі, падтрымліваць на міжнароднай арэне права Літвы на віленскую тэрыторыю[85]. Заключэнне дадзенага дагавора актывізавала беларускую палітычную эміграцыю, узняло агульны настрой і жаданне зноў працаваць на карысць ажыццяўлення беларускіх дзяржаўніцкіх ідэалаў, хоць і ў такіх абмежаваных умовах. В. Ластоўскі ў адным са сваіх лістоў перадаў словы лаканічнай, але вельмі змястоўнай ацэнкі гэтай дамовы з боку Цвікевіча – «ёсць надзея»[86].

Як Літва, так і ўрад БНР добрасумленна выконвалі пункты падпісанага дагавора. Беларусам былі перададзены неабходныя грошы, Ластоўскі і Цвікевіч разам са сваімі сем’ямі і іншымі членамі ўрада пераехалі ў Коўна, адкуль працягвалі сваю дзейнасць. У 1921–1922 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі разгарнуўся беларускі антыпольскі партызанскі рух, які каардынаваўся з літоўскай тэрыторыі. Тысячы асобнікаў беларускай прапагандысцкай літаратуры выдаваліся ў Коўне і перакідаліся праз мяжу на тэрыторыю Віленшчыны і Гарадзеншчыны. У красавіку 1922 г. у Літве пры непасрэдным удзеле Цвікевіча пачаў выдавацца першы беларускі інтэлектуальны часопіс «Беларускі сцяг». Аляксандр Цвікевіч, безумоўна, спадзяваўся, што правядзенне падобнай дзейнасці некалі дазволіць ураду БНР вярнуцца на беларускую тэрыторыю, а таму заклікаў падтрымліваць стасункі з Літвой. У прыватнасці, ён падкрэсліваў:

---

[84] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 2. С. 944.

[85] ДАРФ. Ф. 5875, воп. 1, спр. 7, арк. 14–15; Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 215–218.

[86] ДАРФ. Ф. 5875, воп. 1, спр. 7, арк. 13.

*Трэба ўзмацоўваць нашу базу ў Літве (...), трэба гуртаваць у стройную сістэму тыя сілы, якія у нас ёсьць. Трэба як мага рэальней звязацца з Вільняй і Горадняй, бо тольки пакуль што там мы можам спадзявацца чаго-небудзь дабіцца*[87].

У верасні 1921 г. дзеля каардынацыі дзейнасці беларускага руху за мяжой і на заходнебеларускіх землях па ініцыятыве ўрада БНР В. Ластоўскага ў Празе была склікана Першая беларуская канферэнцыя. У ёй прымалі ўдзел каля 37 дэлегатаў ад розных беларускіх арганізацый і партый. Старшынёй прэзідыума канферэнцыі быў абраны Аляксандр Цвікевіч[88]. Канферэнцыя большасцю галасоў пацвердзіла імкненне беларускага руху да стварэння незалежнай беларускай дзяржаўнасці, выказала пратэст у сувязі з падпісаннем Рыжскага міру і падзелу беларускіх зямель, асцярожна прызнала, што будучыню Вільні павінны вырашаць беларускі і літоўскі народы. У цэлым мерапрыемства праходзіла ў вельмі ўзнёслых патрыятычных тонах адданасці ідэалам незалежнасці, што адлюстроўвалася, у прыватнасці, у пастаяннай крытыцы дэлегатаў прапольскай арыентацыі. Паказальнай у гэтым плане з'яўляецца патрыятычная прамова, якую Цвікевіч сказаў падчас аднаго з пасяджэнняў канферэнцыі:

*Калі ў нас будуць тольки арыентацыі, а не будзе дзяржаўнага сцержня, не будзе адзінай дзяржаўнай волі, нас перамогуць і зробяць рабамі. Але наша ідэя святая, і яе святасьць дае нам сілы пераносіць нашы крыжовыя мукі*[89].

Аднак паступова літоўскія ўлады пераконваліся, што «віленскае пытанне» не будзе хутка вырашана, а польская дзяржава ўсталявала над гэтай тэрыторыяй поўны кантроль, які ў 1923 г. быў нават прызнаны міжнароднай супольнасцю. Літоўская падтрымка ўрада БНР паступова звужалася, і беларускія дзеячы зноў пачалі адчуваць востры недахоп фінансавых сродкаў для сваёй дзейнасці. Вясной 1922 г. беларуская дэлегацыя ў складзе

[87] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 2. С. 1005.

[88] Пратакол паседжаньняў Беларускай нацыянальна-палітычнай нарады ў Празе, 26–30 верасьня 1921 г. // Спадчына. 1999. № 5–6. С. 12.

[89] Тамсама. С. 24.

В. Ластоўскага і А. Цвікевіча спрабавала прыняць удзел у Генуэзскай канферэнцыі, дзе, між іншым, уздымалася і «віленскае пытанне». Прадстаўнікі ўрада БНР па патрабаванні савецкай дэлегацыі не былі дапушчаны да афіцыйных пасяджэнняў, аднак паспелі падаць старшыні канферэнцыі, італьянскаму прэм'ер-міністру Луіджы Факта зварот[90]. У дакуменце, сярод іншага, беларуская дэлегацыя рабіла пэўны тактычны крок – прызнавала права Літвы на Віленшчыну, а Вільню называла «стольным местам Літоўскай дзяржавы»[91]. Аднак дадзеныя фармулёўкі праз некаторы час былі вельмі негатыўна ўспрыняты ў беларускім эміграцыйным асяроддзі. В. Ластоўскі, як старшыня ўрада БНР, будзе абвінавачаны ў невыкананні пастаноў Першай беларускай канферэнцыі і самачынных дзеяннях. А. Цвікевічу давядзецца прызнаць сваю памылку і раскаяцца[92]. Паміж абодвума дзеячамі пачаліся ўзаемныя супярэчнасці і абвінавачванні, таму ва ўрадзе БНР наспяваў новы палітычны крызіс.

У 1923 г. палітыка Літвы ў «беларускім пытанні» рэзка змянілася. Літоўскія ўлады адмовіліся выконваць падпісаны раней дагавор і прапанавалі беларускім дзеячам наўпрост перайсці на службу ва ўрадавыя ўстановы[93]. Такую прапанову прыняў В. Ластоўскі, які выйшаў з усіх структур БНР і стаў звычайным службоўцам літоўскага Міністэрства замежных спраў[94]. Астатнія дзеячы, у тым ліку і А. Цвікевіч, спадзяваліся знайсці новых саюзнікаў на міжнароднай арэне і працягвалі праект БНР. 23 жніўня 1923 г. на пасяджэнні прэзідыума Рады БНР быў абраны новы кабінет міністраў на чале з А. Цвікевічам, які таксама працягваў выконваць функцыі міністра замежных спраў. У новы ўрад увайшлі Васіль Захарка, Лявон Заяц, Уладзімір Пракулевіч і Язэп Варонка[95]. Зразумела, што пасля змены адносін літоўцам не падабалася і не было патрэбным знаходжанне структуры, якая прэтэндавала на дзяржаўныя функцыі, на сваёй тэрыторыі, таму ўрад БНР апынуўся зноў «на чамаданах».

[90] Błaszczak T. Białorusini w Republice Litewskiej, 1918–1940: rozprawa doktorska. Toruń, 2012. S. 185.

[91] Знешняя палітыка Беларусі. Т. 1. С. 308.

[92] Błaszczak T. Białorusini w Republice Litewskiej... S. 186.

[93] Аляксандр Цвікевіч: «Ліквідацыя БНР не была манеўрам»... С. 216.

[94] Błaszczak T. Białorusini w Republice Litewskiej... S. 189.

[95] Чернякевич А. БНР. Триумф побежденных. С. 260.

У верасні 1923 г. практычна ўсе яго дзеячы пераехалі ў Прагу. У Коўне застаўся толькі А. Цвікевіч, які дзеля таго, каб пракарміць сваю сям'ю, адчыніў у горадзе прыватную кнігарню[96].

Дзейнасць А. Цвікевіча на пасадзе прэм'ер-міністра БНР мала чым адрознівалася ад дзейнасці такіх самых кіраўнікоў шматлікіх антыбальшавіцкіх урадаў народаў былой Расійскай імперыі, якія знаходзіліся ў розных кутках Еўропы. Ён працягваў накіроўваць розныя мемарандумы і звароты на міжнародныя форумы, марна спрабуючы зноўку ажывіць беларускае пытанне ў кулуарах еўрапейскай палітыкі. Таксама меў спадзяванні на адраджэнне беларуска-літоўскага саюза і ўзнаўленне сумеснай барацьбы за Вільню, чаму, дарэчы, прысвяціў два малавядомыя артыкулы ва ўрадавым афіцыйным органе Літвы – газеце «Lietuva». Надзеі Цвікевіча, аднак, былі міражом: у літоўскага ўрада існаваў ранейшы падыход да беларускай справы, у якім абсалютна не было месца нейкім урадавым беларускім структурам. Апынуўшыся ў ковенскай «адзіноце», Аляксандр Цвікевіч пачаў таксама наладжваць пэўныя сувязі як з заходнебеларускімі актывістамі ў Польшчы, так і з савецкім паўпрэдствам у Літве. Напэўна, ужо ў 1923 г. у яго выспела думка аб вяртанні на беларускія землі, хістанні былі толькі, у якую частку Беларусі вяртацца – заходнюю ці ўсходнюю.

У жніўні 1923 г. А. Цвікевіч даслаў ліст да свайго былога апанента А. Луцкевіча, які на той час жыў у Вільні, дзе прапанаваў таму забыць старыя крыўды і ахарактарызаваць становішча беларускай справы ў Польшчы[97]. У дастаткова хуткім адказе Луцкевіч падкрэсліў сваё расчараванне ўсімі міжнароднымі спробамі пошуку падтрымкі беларускага руху і недвухсэнсоўна даў зразумець Цвікевічу, што Беларусь трэба «будаваць на мясцох», г. зн. спрыяць развіццю беларускасці непасрэдна на беларускіх землях[98]. Каб нейкім чынам аб'яднаць расколатую эміграцыю з беларускімі асяродкамі ў Заходняй Беларусі, Луцкевіч прапаноўваў стварыць законспіраваную цэнтральную арганізацыю, куды б уваходзілі найбольш актыўныя і вядомыя прадстаўнікі беларускага руху. У далейшым падобная арганізацыя пад умоўнай назвай

[96] Пасля выезду А. Цвікевіча ў БССР гэтай кнігарняй валодаў беларускі дзеяч Сымон Якавюк.

[97] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 2. С. 1426.

[98] Тамсама. С. 1440.

«Краёвы цэнтр» была створана ў Вільні пад эгідай таго ж Луцкевіча[99]. Тым не менш, Цвікевіч не ўбачыў перспектывы ў пераездзе ў Заходнюю Беларусь, дзе антыпольская рыторыка ўрада БНР апошніх чатырох гадоў адразу стала б падставай для палітычнага пераследу.

Паралельна з гэтым А. Цвікевіч часта наведваў у Коўне савецкага паўнамоцнага прадстаўніка Івана Лорэнца, з якім абмяркоўваў магчымасць вяртання ў БССР. Апошні ў адным са сваіх рапартаў зазначыў:

> *Несумненна, яго* (Цвікевіча. – *А. Г.*) *група яшчэ не адмовілася ад планаў па стварэнні незалежнай дэмакратычнай беларускай дзяржавы, але ён лічыць, што адзінай магчымасцю для работы ў беларускім духу з'яўляецца Менск...*[100]

Чаму Аляксандр Цвікевіч, з'яўляючыся перакананым патрыётам і незалежнікам, вырашыў згарнуць акцыю БНР за мяжой? На нашу думку, на гэта ўплывалі два фактары. Па-першае, новыя ўмовы развіцця беларускага руху ў 1920-я гг. перамясцілі асноўную ўвагу амаль усіх беларускіх актывістаў на родныя землі. Беларусізацыя ў БССР, шырока разрэкламаваная бальшавікамі, з аднаго боку, і ўтварэнне беларускай фракцыі ў польскім парламенце, пачаткі дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў Заходняй Беларусі – з другога, шмат у чым «легалізавалі» беларускі рух і зрабілі непатрэбным існаванне эміграцыйнага «падполля». Цвікевіч, як чалавек, які, безумоўна, валодаў пэўным стратэгічным мысленнем, разумеў, што ў такіх умовах далейшая дзейнасць урада БНР зойдзе ў тупік і распадзецца сама па сабе. Другім, і, на наш погляд, вырашальным, быў бытавы фактар. На той час Аляксандр Цвікевіч жыў у Коўне разам з жонкай Зінаідай і пяццю дзецьмі ў вельмі сціплых умовах, а адзіным сродкам даходу для вялікай сям'і было ўтрыманне невялікай кнігарні. У пачатку 1924 г. памерла яго дачка Ірына, што, безумоўна, стала значным штуршком для ўладкавання сямейнага побыту[101]. Менавіта жаданні жыццёвай стабільнасці для сваёй сям'і і атрымання сталага заробку маглі быць галоўным фактарам у рашэнні Цвікевіча вярнуцца ў Менск.

[99] Чернякевич А. БНР. Триумф побежденных. С. 268.
[100] Błaszczak T. Białorusini w Republice Litewskiej... S. 258.
[101] Вабішчэвіч А. Аляксандр Цвікевіч (1883–1937). С. 217.

Жаданне часткі дзеячаў БНР спыніць сваю працу і пераехаць у БССР стала добрай нагодай для савецкай дыпламатыі выкарыстаць гэта ў прапагандысцкіх і ідэалагічных мэтах. Дзеля працы ў эміграцкім асяроддзі і канчатковай ліквідацыі ўрада БНР быў накіраваны супрацоўнік савецкага паўпрэдства ў Варшаве Аляксандр Ульянаў, якога гісторык Андрэй Чарнякевіч трапна назваў «лялькаводам»[102]. Цвікевічу было выстаўлена катэгарычнае патрабаванне: альбо прыняць усе ўмовы БССР, альбо разарваць з ёй сувязі назаўсёды[103]. Ён згадзіўся на першую прапанову, што трэба было замацаваць дакументальна і адлюстраваць перад усім беларускім рухам. 14–15 кастрычніка 1925 г. у Берліне намаганнямі Цвікевіча і яго савецкіх «куратараў» была склікана Другая беларуская канферэнцыя, на якой прысутнічала 17 дэлегатаў. У адной з рэзалюцый канферэнцыі Менск прызнаваўся цэнтрам беларускага адраджэння, а барацьба супраць Савецкай Беларусі лічылася «здрадай справе вызвольнага беларускага руху»[104]. Урэшце, 15 кастрычніка 1925 г. Рада народных міністраў БНР на чале з А. Цвікевічам прыняла пастанову аб ліквідацыі ўрада і прызнанні Менска адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі. Дакумент падпісалі А. Цвікевіч, У. Пракулевіч, Л. Заяц. У лістападзе 1925 г. усе гэтыя дзеячы пераехалі ў сталіцу БССР. У прыватнасці, А. Цвікевічу на пераезд савецкімі ўладамі было выдаткавана 430 долараў[105]. За мяжой засталася частка былых функцыянераў структур БНР, у прыватнасці, П. Крачэўскі, В. Захарка і інш.

Неабходна заўважыць, што ліквідацыя ўрада БНР не была запланаванай акцыяй савецкай агентуры ці дыпламатыі, а свядомым выбарам самога А. Цвікевіча і некаторых яго калег. Разуменне таго, што праект БНР знаходзіцца ў тупіку і вычарпаў сябе, давалася Цвікевічу коштам значных маральных высілкаў. У сваіх паказаннях органам АДПУ ў 1930 г. наконт гэтага ён адзначаў:

*Ліквідаваць традыцыю, якая звязвала нас пераемна з «Нашай нівай», ліквідаваць цэнтр, які з'яўляўся свайго роду жывой*

[102] Чернякевич А. БНР. Триумф побежденных. С. 275.
[103] Сакалоўскі У. Надзвычайная місія БНР у Нямеччыне (1919–1925). С. 303.
[104] Тамсама. С. 307.
[105] Тамсама. С. 309.

*дэкларацыяй усяго беларускага народніцкага руху, раскасаваць і ўбіць асінавы кол у палітычную ўстаноўку, якая афармляла нацыянальна-дэмакратычны ідэал гэтага руху, было не так лёгка, як гэта можа падавацца з боку. Для гэтага трэба было пераможыць цяжкую ўнутраную барацьбу, наважыцца на папрок у рэнегацтве, у здрадзе «нацыянальнай справе» – папрок, які быў сапраўды кінуты ў твар і мне, і маім сябрам на наступны дзень пасля рашэнняў Берлінскай канферэнцыі*[106].

Кожны з былых сяброў урада БНР вяртаўся ў Менск з вельмі цяжкімі пачуццямі і згрызотамі сумлення, застаючыся, аднак, адданым беларускай справе патрыётам.

Першапачаткова, з канца 1925 г., Аляксандр Цвікевіч працаваў кансультантам у Народным камісарыяце фінансаў БССР, а з вясны 1926 г. – неадменным (вучоным) сакратаром Інстытута беларускай культуры[107]. Значным дасягненнем Цвікевіча на гэтай пасадзе была арганізацыя і правядзенне Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу ў лістападзе 1926 г., на якой ён уваходзіў у склад прэзідыума і адказваў за ўсе арганізацыйныя пытанні[108]. Таксама ў гэты перыяд ён падрыхтаваў і выдаў грунтоўнае даведачнае выданне аб Інбелкульце – «Інстытут беларускае культуры: гісторыя ўзнікнення, сучасная структура, навукова-даследчая дзейнасць» (Менск, 1926). Знаёмая сям'і Цвікевічаў А. Саковіч пазней прыгадвала:

*У першы ж год па звароце з эміграцыі А. Цвікевіч выявіў усю сілу сваіх здольнасцей і таленту. Галоўным чынам у Інстытуце беларускай культуры канцэнтравалася яго навукова-грамадская праца*[109].

Аднак летам 1927 г., хутчэй за ўсё, па прычыне вяртання з-за мяжы свайго былога канкурэнта В. Ластоўскага, Цвікевіч быў

[106] Аляксандр Цвікевіч: «Ліквідацыя БНР не была манеўрам»... С. 218.

[107] Паказальна, што літаральна праз год замест Цвікевіча гэтую пасаду зойме яго былы палітычны канкурэнт В. Ластоўскі, які таксама пераедзе з Літвы ў БССР.

[108] Працы Акадэмічнае конфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (14–21 лістапада 1926 г.). Менск, 1927. С. 10.

[109] Саковіч А. Александр Цьвікевіч // The Byelorussian Times. 1976. Nr. 7. С. 7.

адхілены ад пасады сакратара Інбелкульта і працаваў там толькі як звычайны навуковы супрацоўнік[110]. Пасля трансфармацыі Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук Цвікевіч застаўся працаваць у навуковых структурах апошняй у якасці вучонага-гісторыка. Апошняе яго месца працы на 1929 г. – старшыня камісіі па гісторыі асветы Беларусі Беларускай акадэміі навук[111].

Малавядомай часткай біяграфіі А. Цвікевіча ў савецкі перыяд з'яўлялася яго грамадская актыўнасць, якая ў некаторай ступені яшчэ дазвалялася ва ўмовах нэпаўскай БССР. Да 1929 г. ён працаваў намеснікам старшыні Беларускага камітэта Чырвонага Крыжа і актыўна друкаваўся ў перыядычным выданні гэтай арганізацыі. З 1926 г. Аляксандр Цвікевіч быў адным з ініцыятараў стварэння Беларускага таварыства культурнай сувязі з заграніцай і ў сакавіку 1927 г. быў абраны сакратаром прэзідыума гэтай арганізацыі[112]. Верагодна, яго ранейшыя міжнародныя кантакты цяпер спатрэбіліся ўладам БССР для папулярызацыі здабыткаў савецкай беларусізацыі на сусветнай прасторы.

Аднак пасіянарнасць Аляксандра Цвікевіча і іншых былых актывістаў БНР пасля пераезду ў савецкую Беларусь хутка сутыкнулася з пачаткам станаўлення таталітарнай сістэмы і згортваннем нацыянальнай эмансіпацыі, дазволенай бальшавікамі на «ўскраінах» былой імперыі. Моцны нацыянальны пасыл Цвікевіча, які, безумоўна, не замяніўся на савецкі інтэрнацыяналізм пасля прыезду ў Менск, быў ужо непатрэбны для савецкай дзяржавы, якая пачала шлях да стварэння *homo soveticus* – супольнасці савецкіх людзей з агульнай ідэнтычнасцю і нормамі жыцця. Ужо ў снежні 1926 г. камісія КП(б)Б, якая вывучала настроі мясцовай інтэлігенцыі, адносна Цвікевіча зазначыла: «сущности советской власти не осознал»[113]. Тым не менш, у 1926–1929 гг. ён яшчэ актыўна друкаваўся як публіцыст у беларускіх савецкіх газетах, публікаваў навуковыя артыкулы і рэцэнзіі ў часопісах, напісаў фундаментальную працу «"Западноруссизм": нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в.»,

---

[110] Аляксандр Цвікевіч: «Ліквідацыя БНР не была манеўрам»... С. 217.

[111] Научно-организационные связи Академии наук СССР и Академии наук БССР, 1929–1941 гг.: сборник документов. Минск, 2015. С. 13.

[112] Хроніка беларускае культуры // Полымя. 1927. № 2. С. 204.

[113] Інстытут беларускай культуры, 1922–1928: дакументы і матэрыялы. Мінск, 2011. С. 162.

якая, аднак, была канфіскавана ўжо адразу пасля выдання. Даследаванні Цвікевіча па гісторыі Беларусі былі папулярныя ў тагачасным навуковым моладзевым асяроддзі[114].

Узмацненне пераследавання і цкавання нацыянальнай інтэлігенцыі ў рамках кампаніі па барацьбе з «нацыянал-дэмакратызмам» у БССР у 1928–1930 гг. не магло не адбіцца на былых эмігрантах. Аляксандр Цвікевіч трапляў у тую групу беларускай інтэлігенцыі, якая, паводле ўлад, была найбольш небяспечнай з ідэалагічнага пункту гледжання[115]. Пачаўся працэс астракізму былых дзеячаў БНР. У прыватнасці, у чэрвені 1930 г. партыйная ячэйка Беларускай АН вынесла пастанову прасіць кіраўніцтва рэспублікі перавесці Аляксандра Цвікевіча на работу ва ўстановы «не навуковага характару», бо ён робіць у сваіх працах шмат «ідэалагічных памылак»[116]. Разам з гэтым, на поўную моц пачаў раскручвацца рухавік палітычных рэпрэсій. 4 ліпеня 1930 г. Цвікевіча адным з першых арыштоўваюць па знакамітай сфабрыкаванай справе «Саюза вызвалення Беларусі» – нібыта падпольнай арганізацыі беларускай інтэлігенцыі, мэтай якой было зрынуць савецкі лад і ўсталяваць на Беларусі дэмакратычную рэспубліку. Падчас арышту і ператрусу ў кватэры Цвікевіча той моўчкі назіраў за працай супрацоўнікаў ДПУ, а пасля голасна сказаў свайму сыну Віктару: «Глядзі, Віктар, і памятай. Усё жыццё памятай!»[117].

У кастрычніку 1930 г. старшыня ДПУ БССР Рыгор Рапапорт дакладваў савецкаму кіраўніцтву аб сваіх поспехах і раскрыцці «падпольнай фашысцкай арганізацыі» беларускай інтэлігенцыі. Паводле савецкіх спецслужбаў, дадзеная арганізацыя ўтварыла нават свой уласны «ценявы» кабінет міністраў, дзе Аляксандр Цвікевіч займаў пасаду міністра замежных спраў[118]. Аднак у рапартах не ўказвалася, што Цвікевіч як прафесійны юрыст вельмі годна трымаўся на допытах, адмаўляў усе выстаўленыя абвінавачанні і працягваў падкрэсліваць свае нацыянальныя беларускія

---

[114] Саковіч А. Александр Цьвікевіч. С. 7.

[115] Маркава А. Шлях да савецкай нацыі: палітыка беларусізацыі (1924–1929). Мінск, 2016. С. 75.

[116] Академик В.М. Игнатовский: документы и материалы. Минск, 2010. С. 160–161.

[117] Саковіч А. Александр Цьвікевіч. С. 8.

[118] Елісееў А. Зміцер Жылуновіч: чырвоны адраджэнец. С. 200.

прынцыпы[119]. Яго «ўпартасць» стала прычынай таго, што жонцы вельмі часта адмаўлялі ў спатканнях і перадачах для свайго мужа[120]. 10 красавіка 1931 г. Аляксандр Цвікевіч быў асуджаны на 5 гадоў ссылкі. Разам з сям'ёй[121] ён адбываў пакаранне спачатку ў Пермі, пасля ў Ішыме і Сарапуле (Удмуртыя). У снежні 1937 г. ён быў паўторна арыштаваны і ў хуткім часе расстраляны ў Менску (30 снежня 1937 г.).

Цяжкі лёс беларускай інтэлігенцыі XX стагоддзя адбіўся і на ўсёй сям'і Цвікевічаў. Малодшы брат Аляксандра – Іван Цвікевіч – лекар, які таксама прымаў актыўны ўдзел у беларускім руху, быў перакладчыкам медыцынскай тэрміналогіі на беларускую мову, стаў таксама ахвярай сфабрыкаванай справы «Саюза вызвалення Беларусі». Старэйшы брат, Мікалай, увесь міжваенны перыяд пражыў у Берасці, дзе выкладаў у мясцовых школах маляванне і геаграфію. У пасляваенны час ён пераехаў у польскі горад Плоцк, дзе і памёр. Да беларускага руху ён ставіўся абыякава і нават крытычна, не разумеў прычын удзелу ў ім сваіх братоў, аднак пакінуў вельмі цікавыя сямейныя ўспаміны. Сястра Аляксандра Цвікевіча, Надзея, а таксама яго дзеці засталіся жыць у Расіі і ніякім чынам не звязалі сваё жыццё з беларускасцю.

Сваякі Аляксандра Цвікевіча прыгадвалі, што да любой справы, нават самай супярэчлівай і цяжкай, ён адносіўся з усмешкай і весялосцю. Напэўна, такім аптымістам Аляксандр Цвікевіч застаўся да канца сваіх дзён. А яшчэ Цвікевіч – выдатны аратар і таленавіты публіцыст. Яго публіцыстыка – гэта скарб нацыянальнай філасофіі і грамадскай думкі. У гісторыі Беларусі перад яго прозвішчам шмат дзе можна паставіць прыметнік «першы». Першы, хто ўзняў пытанне беларускай дзяржаўнасці на міжнароднай арэне, першы інтэлектуал, які пачаў выдаваць першы беларускі інтэлектуальны часопіс, першы, хто з вялікай масы бежанцаў часоў Першай сусветнай вайны зрабіў нацыянальна арыентаваную сілу. Менавіта дзякуючы кампраміснасці і дыпламатычнаму таленту Цвікевіча, яго разважлівасці беларускі

119 Аляксандр Цвікевіч: «Ліквідацыя БНР не была манеўрам»... С. 219.

120 Саковіч А. Александр Цьвікевіч. С. 8.

121 На той час у яго з жонкай Зінаідай было трое дзяцей: Таццяна, Марыя і Віктар (чацвёрты, малодшы сын Цвікевіча Вадзім памёр у 1928 г. ад шкарлятыны).

рух, абмежаваны ў сваіх магчымасцях, меў значныя фінансавыя сродкі, за якія выдаваліся тысячы асобнікаў беларускіх кніг, выходзілі газеты, адчыняліся школы. Усё гэта папаўняла крок за крокам скарбонку беларускасці і прывяло, урэшце, да незалежнасці Беларусі. Аднак, на жаль, сёння ў Беларусі Аляксандр Цвікевіч не стаў «месцам памяці»: у яго гонар не названыя вуліцы нашых гарадоў або аўдыторыі ва ўніверсітэтах, няма мемарыяльных шыльдаў. Спадзяемся, што выданне дадзенага збору твораў дапаможа нашаму грамадству звярнуць больш шырокую ўвагу на спадчыну і асобу Аляксандра Цвікевіча, шчыры беларускі патрыятызм якога варты ўшанавання сённяшнімі нашчадкамі.

*Аляксандр Горны*